Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

КОШТ НУМАРУ 4 кап.

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не варачаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 70 к.
„ 3 „	2 р. — к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	7 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	—20 к.
мясцовыя	—10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок капітарэлі пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок капітарэлі наперад тэксту	1 р. — к.
За радок капітарэлі перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьпешныя на 50 проц. дарожай. Звыш тарыфу біржацкі 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант	85 кап.
За кожны дадатковы	25 „
Беспрадоўж. і чарговапазарыйныя за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ў ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.

АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

8-мы ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 90 (1982) Серада, 20-га красавіка 1927 г.

Аб масавым абсьледваньні гандлёвых арганізацый.

Згодна пастановы ўраду праведзена зьніжэньне аптова-продажных цэн на некаторыя вырабы нашай прамысловасьці, як крамніна, трыкатаж, скураныя тавары, абутак, соль, цукер і інш. Апроч таго, НК Гандлю разам з каапэрацыйнымі саюзамі пераглядзеў у бок зьніжэньня гандлёвыя надбаўкі па ўсіх зьвеньнях тавараправоднай сеткі.

Зьніжэньне аптова-продажных цэн, гандлёвых надбавак і накладных выдаткаў павінна выклікаць зьніжэньне розьнічных цэн у сярэднім на 10 проц. Аднак, фактычнае зьніжэньне цэн у нашых каапэрацыйных і дзяржаўных гандлёвых арганізацыях праходзіць вяла. У шмат якіх выпадках зьніжэньне цэн яшчэ не даведзена да спажыўца, а калі даведзена, дык ня поўнасьцю.

Праведзенае ў некаторых акругах папярэдняе абсьледаваньне гандлёвых арганізацый выявіла шмат выпадкаў трубага парушэньня цэн у бок павялічэньня іх. Асабліва недапушчальныя факты выяўлены абсьледваньнем менскай АКК і акркамгандлю ў Узьдзенскім, Койданаўскім, Негарэльскім і Ракашыцкім спажывецкіх таварыствах. Выяўлена, што на галоўныя прамысловыя тавары, як крамніна, скура, чыгун і інш. былі павялічэньні ўстаноўленых надбавак на 10 і больш проц. Абсьледаваньне ў іншых акругах (Гомсль) таксама выявіла шмат парушэньняў устаноўленых надбавак.

Такім чынам, праведзеныя частковыя праверкі кажуць, што зьніжэньне цэн у шмат якіх выпадках, асабліва ў вёсцы, не даходзіць да спажыўца, затрымліваючыся ў гандлёвым апараце. З гэтае прычыны, каб сапраўды своечасна ажыцьцявіць настановы партыі і ўраду аб зьніжэньні цэн на 10 проц. да 1-га чэрвеня, неабходна арганізаваць масавую праверку зьніжэньня розьнічных цэн.

Гэтаю праверкаю павінны быць ахоплены ў першую чаргу ўсе розьнічныя і аптовыя крамы каапэрацыйных, грамадзкіх і дзяржаўных арганізацый. Як у гарадох, так і ў сельскіх мясцовасьцях масаваю праверкаю каапэрацыйнага і дзяржаўнага гандлю павінна быць выяўлена:

а) фактычныя цэны на 1-га студзеня і да дню абсьледваньня і наколькі яны адпавядаюць устаноўленым цэнам Наркамгандлю; б) разьмер зьніжэньня цэн; в) разьмер гандлёвых налічэньняў і наколькі яны адпавядаюць нормам налажэньня, якія ўстаноўлены Наркамгандлю; г) разьмер зьніжэньня гандлёвых і накладных выдаткаў; д) ці практыкуюць гандлёвыя арганізацыі пасьля зьніжэньня цэн одпуск ніжэйшай якасьці тавару; е) ці не наглядаецца выпадкаў ўхіленьня гандлёвымі арганізацыямі ад продажу солі, нафты, цукру, масла, цьвікоў і г. д., на якія ўстаноўлены зьніжаныя цэны; ж) вывяўць працу грамадзкіх арганізацый: крамных, рэвізійных камісій, каапэрацыйных сэкцый, жанчын дэлегатак і г. д.

Якімі-ж сіламі павінна праводзіцца абсьледваньне?

Гэта абсьледваньне ў асноўным павінна праводзіцца грамадзкімі арганізацыямі. У гарадох—членамі гарсаветаў, прадстаўнікамі прафсаюзаў, жанчынамі-дэлегаткамі, членамі рэвізійных і крамных камісій і г. д.

У сялянскіх мясцовасьцях—абсьледваньне павінна рабіцца: інструктарамі акруговых каапэрацыйных саюзаў і працаўнікамі акруговых камісарыятаў гандлю, павінна быць абсьледавана ня менш 30 проц. нізавых каапэратываў шляхам выезду на месцы, рэшта 70 проц. нізавых каапэратываў павінна быць абсьледавана таксама прадстаўнікамі грамадзкіх арганізацый, як-та: членамі райвыканкомаў, селсаветаў, прадстаўнікамі каміт. узаемадапамогі, жанчынамі—дэлегаткамі, прадстаўнікамі прафсаюзаў, рэвізійн. камісіямі і г. д. Між іншым райкомам і райвыканкомам неабходна правесьці заслухоўваньне справаздач праўленьняў і рэвізійных камісій каапэратываў аб выніках па зьніжэньні цэн.

Гэта абсьледваньне павінна праходзіць пад кантролем шырокіх мас рабочых і сялян, нагэтаму пасьля правядзеньня абсьледваньня павінна быць прэведзена шырокая справаздачасьць прадстаўнікоў арганізацый, якія праводзілі абсьледваньне.

Ініцыятыва арганізацыі абсьледваньня павінна праводзіцца: у гарадох—гарсаветамі, у акругах—акрвыканкомамі і райвыканкомамі. Прычым да гэтага абсьледваньня гандлёвых арганізацый неабходна прыступіць як мага хутчэй з тым, каб скончыць гэткае не пазьней 15 мая.

Адпаведныя дырэктывы аб правядзеньні абсьледваньня ўжо дадзены нашым партыйным і савецкім арганізацыям. Неабходна, каб каапэратыўныя саюзы, прафэсыянальныя арганізацыі, гарсаветы, а таксама акрвыканкомы, райвыканкомы і інш. грамадзкія арганізацыі выявілі максімум актыўнасьці ў правядзеньні гэтага абсьледваньня.

Ад актыўнасьці грамадзкіх арганізацый, а таксама шырокіх мас рабочых і сялян залежыць посьпех гэтай працы на зьніжэньні розьнічных цэн.

І. Адамайціс.

САВЕЦКА-АЎГАНСКІ ЎГАВОР АБ НЕНАПАДЗЕ.

КАБУЛ, 15-IV. 10-га красавіка ў Кабуле ў міністэрстве замежных спраў адбыўся абмен ратыфікацыямі ўгавору аб нэйтралітэце і ўзаемным ненападзе між СССР і Аўганістанам, падпісанага 31-га жніўня 1926 году у Пагмане.

ДА НАРМАЛЬНЫХ ЗНОСІН МІЖ ШВЭЙЦАРЫЯЙ І СССР.

БЭРЛІН, 18-IV. Наконт ліквідацыі савецка-швэйцарскага канфлікту выходзячая ў Базэлі камуністычная газэта «Форвэртс» заяўляе: «Уся рабочая кляса Швэйцарыі прыме паведамленьне аб ліквідацыі канфлікту з вялікім задаволеньнем. Але рабочая кляса павінна неадкладна патрабаваць фармальнага прызнаньня савецкага ўраду з боку ўраду Швэйцарыі і заснаваньня нармальных дыпляматычных дачыненьняў між абодвымі краямі».

Супольныя дэманстрацыі нямецкай кампартыі і с.-д. 1 Мая.

БЭРЛІН, 14-4. Усюды ў Нямеччыне акруговыя, або мясцовыя арганізацыі кампартыі зьвярнуліся да арганізацый сацыял-дэмакратычнае партыі і аддзелаў усянямецкага аб'яднаньня прафсаюзаў з прапановаю арганізаваць 1-га мая супольныя дэманстрацыі пад лёзунгамі: «Проці небясьпекі вайны», «За кітайскую рэвалюцыю», «За сацыяльна-палітычныя патрабаваньні рабочых», «Проці фашызму і ўраду буржуазнага блёку».

У шмат якіх мясцох сацыял-дэмакраты або зусім не адказалі, або адхілілі прапанову кампартыі. Такія выпадкі былі ў Бэрліне, Гамбурзе і Хэмніцы.

Аднак у некаторых гарадох усё-ж такі было забясьпечана супольнае выступленьне 1-га мая, як у Эрфурце, Зуле, Плаўэне, Вісьмары, Шпэйбэрзе, Нордгаўзэне, Франкэнгаўзэне, Вэрдаў, Віттельсдорсе, Райхэнбасе, Рэнсбурзе, Эльсьніцы і г. д.

Урадавы крызіс у Японіі.

Сэйюкай дамагаецца большасьці ў урадзе.

ТОКІЁ, 18-IV. Урад Вакацукі застанецца выконваць свае абавязкі, пакуль ня будзе ўтворан новы габінэт.

«Токіё-Асакі» і «Цьзі-Цьзі» выказваюцца проці заснаваньня пазапартыйнага габінэту, заяўляючы, што фармаваньне ўраду павінна быць даручана партыі Сэйюкай.

«Кукумін» заяўляе, што пытаньне, хто будзе фармаваць габінэт, ня мае значэньня, толькі-б новы ўрад выкалаў такія тры заданьні: 1) адкавіць і ўпарадкаваць фінансы; 2) стаць на шлях рашучае палітыкі ў дачыненьні да Кітаю і 3) ажыцьцёвіць рэформу верхняе палаты.

На ўчарашнім пасяджэньні тайнае рады імпэратара, дзе прысутнічалі ўсе сябры ўраду і імпэратар, некаторыя сябры рады востра крытыкавалі палітыку Шыдэхары ў Кітаі. Шыдэхара спрачаўся проці гэтых зацьверджаньняў і патрабаваў доказаў.

Ёсьць, аднак, некаторыя падставы думаць, што японская палітыка ў Кітаі па сутнасьці ня зьменіцца, нават калі ўрад будзе складзен партыяй Сэйюкай.

Танака—кандыдат у прэм'еры.

ТОКІЁ, 19-IV. Агэнцтва Шымбун-Рэнго паведамляе: «Генэрал барон Гііцы Танака, старшыня партыі Сэйюкай выклікан у палац. Генэрал Танака, як відаць, будзе назначан прэм'ерам».

Аб'яднаная антыфашыцская Ліга.

ПАРЫЖ, 18-IV. Зарубежныя арганізацыі італьянскіх партый унітарыяў, максімалістаў, рэспубліканцаў, канфэдэрацыя працы і арганізацыі італьянскай лігі абароны правоў чалавека стварылі аб'яднаную антыфашыцскую асацыяцыю.

У цэнтральны камітэт увайшлі Мадыляні, Анжэліка Балабанава і інш.

У абарону Сако і Ванцэці.

10-ці тысячны мітынг у Нью-Ёрку.

НЬЮ-ЁРК, 19-IV. У Нью-Ёрку адбыўся пад адкрытым небам 10-ціцысячны мітынг пратэсту проці прысуду сьмерці на справе Сако і Ванцэці. У Мітынг ухваліў рэзалюцыю, якая патрабуе скліку агульнанямецкае канфэрэнцыі, каб арганізаваць усеагульную забастоўку ў знак пратэсту.

IV УСЕСАЮЗНЫ ЗЬЕЗД САВЕТАЎ.

Адчыненьне зьезду.

Посьпехі нашага будаўніцтва прызнаў увесь сьвет.

З уступнае прамовы тав. Калініна.

МАСКВА, 18-IV. У 6 гадзін 18-га красавіка ў Вялікім Тэатры адчыніўся 4-ы Ўсесаюзны Зьезд Саветаў.

У лёжы дыпляматычнага корпусу—прадстаўнікі замежных дзяржаў, у лёжах журналістаў—прадстаўнікі замежнае прэсы і органаў савецкага друку цэнтральных, рэспубліканскіх, вабласных і губэрскіх.

Калінін, спатканы гучнымі воплескамі, зьвяртаецца з прамоваю да зьезду.

Самаю характэрнаю асаблівасьцю сёньняшняга дню,—гаворыць Калінін,—зьяўляецца тое, што, пачынаючы з расейскіх белагвардзейцаў і канчаючы цьвёрдалобымі кансэрватарамі Англіі **посьпехі нашага будаўніцтва сталі ўсім прызнавацца.**

Ад часу набудовы эгіпецкіх пірамід і кітайскае сьцяны да апошніх кітайскіх растрэлаў цягнецца істужка мучэньняў працоўных.

Толькі гэтым і можна растлумачыць лютасьць буржуазнае прэсы, разгул паклёпу на рабочых і сялян Саюзу і той канцэрт шакалаў, які штодзень чуваць каля нашых консульскіх будынкаў у Кітаі. Але **мы вельмі ўпэўнены ў сваёй праваце, каб траціць спакой. Салідарызацыя дыпляматычнага корпусу ў Пекіне з удзельнікамі наскоку ёсьць лепшая агітацыя перад працоўнымі ўсяго сьвету, што імпэрыялісты шукаюць прычыны для зрыву нашае барацьбы за мір. Мы імкнёмся да міру, але калі на нас нападуць і калі рабочыя і сяляне пачуюць небясьпеку вайны, якая пагражае іх заваёвам, тады вораг пачуе на сваёй уласнай скуры моц рэвалюцыйных мас Саюзу, іх здольнасьць бараніцца і наносіць удары ворагу.**

Прамова Калініна некалькі разоў перарываецца знакамі ўхваленьня і гучнымі воплескамі.

Абраньне прэзыдыуму.

Калінін абвяшчае 4-ы Зьезд Саветаў адчыненым. Аркестр выконвае Інтэрнацыянал.

Водлуг прапановы Энукідзе зьезд ушанаваў памяць 11 памёршых членаў Саюзнага ЦВК у тым ліку Фрунзэ, Дзяржынскага, Красіна і Катоўскага. Заля, стоячы, слухае пахавальны марш, выконваемы аркестрам.

Потым Энукідзе агалашае прапанову камуністычнае фракцыі зьезду і нарады беспартыйных дэлегатаў аб колькасным і асабовым складзе прэзыдыуму зьезду і мандатнае камісіі. У прэзыдыум зьезду прапанова абраць 94 члены. Па згодзе камуністычнае фракцыі і нарады беспартыйных дэлегатаў у прэзыдыум уваходзяць прадстаўнікі саюзных рэспублік, месц, у тым ліку сяляне і рабочыя, непасрэдна зьвязаныя з вытворчасьцю.

У прапануемы сьпіс уваходзіць шэраг беспартыйных членаў зьезду.

Прапанова ўхваляецца аднагалосна.

Пры чытаньні асабовага складу членаў прэзыдыуму, калі агалашаецца імя Сталіна, а таксама Рыкава, раздаецца гром воплескаў, якія пераходзяць у авацыю; горача воплескамі сустракае зьезд агалашэньне імён Бухарына, Варашылава, Калініна, Молатава, Орджанікідзе, Пятроўскага, Томскага, Чубара і шэраг у іншых таварышоў.

У прэзыдыум зьезду абраны: Сталін, Рыкаў, Бухарын, Калінін, Чубар, Пятроўскі, Варашылаў, Чарвякоў, Куйбышаў, Кубяк, Бубноў, Мікаян, Будзённы, Томскі, Энукідзе, Орджанікідзе і інш.

Ад імя прэзыдыуму зьезду Чубар прапануе **абраць старшынёй зьезду Калініна.** Прапанова ўхваляецца адзінагалосна. Калініну зьезд ладзіць авацыю. Пад гучныя воплескі сэкратаром зьезду аднагалосна абіраецца тав. Энукідзе.

Зьезд пераходзіць да заслуханьня справаздачнага дакладу ўраду.

Слова даецца тав. Рыкаву. Зьезд ладзіць Рыкаву шумную авацыю.

Справаздача ўраду СССР.

ДАКЛАД ТАВ. РЫКАВА.

ЗАМЕЖНАЯ ПАЛІТЫКА САВЕЦКАГА ЎРАДУ.

Падзеі не застануць нас непадрыхтаванымі.

Наш Усесаюзны Зьезд Саветаў адбываецца **ва ўмовах вельмі напружаных трывожных міжнародных варункаў.** Наглядаецца значная трывога за магчымасьць далейшага захаваньня і забесьпячэньня спакою. Трывога гэтая асьнована на тым, што ў міжнароднай палітыцы адбываецца шмат падзей, якія ў гісторыі міжнародных дачыненьняў ня раз паўтараліся напярэдадні ўзброеных стычак. З гэтае прычыны **пытаньне, ці не зьяўляецца тое, што дзеецца ў апошні час, пярэддаднем або падрыхтоўкаю вайны,—ёсьць галоўнае пытаньне сучаснае міжнароднае палітыкі.** Гэтае пытаньне шырока дыскутуецца на ўсіх рабочых і сялянскіх сходах і **якія-б падзеі ні здарыліся ў далейшым, яны не застануць наш край непадрыхтаваным.**

Мне здаецца, што галоўных вузлоў у міжнароднай палітыцы ў сучасны момант два: першы—Кітай, а другі—СССР. Навакол гэтых дзяржаў мабілізуюцца варожыя і прыяцельскія ім сілы.

Прычыны агрэсыўнае мабілізацыі проці вызваленчага руху кітайскага народу ў тым, што Кітай зьяўляецца вузлом калёніяльнае палітыкі.

Падаплёка кампаніі „цьвёрдалобых" проці СССР.

Наша дзяржава зьяўляецца аб'ектам варожае агрэсіі капіталізму, бо на тэрыторыі нашае дзяржавы вырашаюцца пытаньні сацыялістычнага будаўніцтва.

Галоўным момантам мабілізацыі грамадзкае думкі і варожых нашаму Саюзу сіл храналёгічна зьяўляецца нота Чэмбэрлена. Самы характар ноты нагэтулькі нязвычайны ў міжнародных дачыненьнях, што цяжка палічыць зьмешчанае ў ёй за сапраўдную прычыну яе выданьня.

Сапраўдныя прычыны ноты кансэрватыўнага ўраду можна ўстанавіць, калі прасачыць за процісавецкай агітацыяй, якая праводзіцца вельмі значнай часткай, калі ня ўсёй партыяй кансэрватараў. Галоўнымі элементамі гэтае прапаганды зьяўляецца: папершае, пытаньне аб царскіх даўгох; падругое, пытаньне аб салідарнасьці рабочае клясы Саюзу ССР з рабочымі масамі Англіі і, у асобку, з стачкаю вугляпокопаў і, патрэцяе, нездаволеньне імпэрыялістаў прыхільнасьцю кітайскага народу да нашага Саюзу, якую яны называюць «удзелам Савецкага Саюзу ў кітайскім вызваленчым руху».

Я лічу патрэбным падкрэсьліць, што ніводнае ў гэтых трох пытаньняў не абгаварвалася паміж нашым і ангельскім афіцыйнымі прадстаўнікамі, нягледзячы на шматразовыя нашы прапановы прыступіць да дзелавых перамоў. Выкарыстоўваньне неабгавораных падзелавому пытаньню для абвастрэньня і разрыву адносін трэба таму лічыць злачынным.

Нас ня прымусяць адмовіцца ад сімпатый пралетарскай барацьбе.

У пытаньні аб становішчы рабочае клясы ў нашым Саюзе і яго правох у сувязі з сусьветным рабочым рухам неабходна ўсім, нават і кансэрватарам, выходзіць з таго, што **наша рэспубліка зьяўляецца рабочай дзяржавай і вось затым ня толькі працоўныя гушчы і рабочыя арганізацыі, але і сам урад нашага Саюзу могуць адкрыта выяўляць сваю брацкую і клясавую салідарнасьць з рабочай клясай і працоўнымі іншых краін. Усялякія спробы прымусіць цяпер рабочую клясу СССР адмовіцца ад гэтага права, альбо прымусіць наш урад абмежаваць свабоду дзейнасьці рабочае клясы ў справе ўзаемнае дапамогі і сувязі з рабочай клясай іншых краін, выходзіць з імкненьняў відазьмяніць самую прыроду савецкае дзяржавы.**

Выкрэсьліць адбыўшыся ў Кастрычніку гістарычны факт арганізацыі дзяржавы дыктатуры пралетарыяту, зьнішчыць усе выцякаючыя адгэтуль вынікі—ніяк нельга. Плятформа Чэмбэрлена—сымпатызаваць капіталістым і мандарынам—выцякае з усяго становішча кансэрватыўнае партыі. **Наша плятформа—сымпатызаваць прыгнечаным рабочым і прыгнечаным народам** (бурныя аплёдысмэнты ўсяе залі). Але калі, прыкладам, мы ўстановім, што кансэрватыўны ўрад сымпатызуе пэнтэкам і тэкстам... Мы... ну заяўляць, што гэта зьяўляецца ўмешваньнем пана Чэмбэрлена ў нашы ўнутраныя справы (сьмех, аплёдысмэнты), Гэтаксама і **нашы сымпатыі да ангельскіх вуглякопаў нельга лічыць умешваньнем савецкага ўраду ва ўнутраныя справы Англіі.**

У нас нямысьліма нават падача на абгавор Зьезду, прыкладам, законапраэкту аб абмежаваньні правоў прафсаюзаў, а ў Англіі гэта ня толькі мысьліма, але зьяўляецца фактам. У гэтым—**розьніца структуры дзьвюх дзяржаў.** (Сьмех). У рабочай дзяржаве рабочыя саюзы вольны рабіць, што яны захочуць, але калі мы забаронім ім гэта, мы перастанем быць урадам рабочых і сялян (аплёдысмэнты).

Ангельскі рабочы рух пачаўся і стачкі рабочых адбываліся шмат раней да Кастрычнікаўскай рэвалюцыі. Ангельскія рабочыя ўпісалі гэткія гэраічныя страніцы змаганьня рабочае клясы, яшчэ за многа год да Кастрычніка, што зазначэньне на тое, нібы «савецкія агэнты» могуць арганізаваць такога рода стачку, як усеагульная стачка трэд-юніёнаў, зьяўляецца проста хлусьнёю на ангельскую рабочую клясу.

Характарызуючым «бесстаронпасьць» ангельскіх кансэрватараў зьяўляецца і другі факт. На час стачкі вуглякопаў ангельскі ўрад дэкляраваў нэйтральнасьць у гэтым канфлікце, аднак перашкаджаў дапамозе галадуючым вуглякопам з іншых краін.

Урад Англіі зрабіў тое, што адпавядала яго клясавым інтарэсам.

Рабочыя нашага Саюзу таксама выканалі свой клясавы абавязак і трэба чакаць, што ва ўсіх падобных выпадках яны зробяць тое-ж самае (воплескі). Пытаньне, каб мы забарапілі нашым рабочым дапамагаць рабочым іншых краёў, павінна быць зьнята з абмеркаваньня. Ніякае зьмены ў палітыцы ў гэтых адносінах савецкі ўрад не дапусьціць (воплескі).

СССР згодзен абгаварыць спрэчныя пытаньні.

Па пытаньні аб даўгох савецкі ўрад ужо ня раз выказваў свой погляд, які ў некаторай меры адбіўся ва ўгаворы з папярэднім урадам Англіі. Гэты ўгавор ужо быў загадзя парафіраван тагачасным прэм'ерам Англіі Макдональдам і старшынёю нашае дэлегацыі тав. Ракоўскім. З прыходам да ўлады кансэрватараў, угавор ня быў зацьверджан. Нашы прадстаўнікі ў Англіі і Ракоўскі, і нябошчык Красін, і Розэнгольц ня раз прапанавалі ангельскаму ўраду перайсьці да канкрэтнага абмеркаваньня новых прапаноў ці зьмен угавору, якія могуць быць пададзены ангельскаю дзяржаваю. Я сьцьвярджаю, што ангельскі ўрад ад гэтага праз увесь час ухіляўся і ніякіх прапаноў не падаваў. **Урад Савецкага Саюзу, каб ажыцьцявіць сваю агульную палітыку спакою, ніколі не адмаўляўся ад перамоў і лічыць па-ранадным і магчымым адхіліць сучасныя напружаныя дачыненьні.**

Падрыхтоўка імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі ў Кітаі.

Нацыянальна-вызваленчы рух Кітаю зьяўляецца зараз адною з галоўных, калі ня самаю галоўнаю прычынаю нездаваленьня савецкім урадам і падачы яму ўсякіх абвінавачаньняў. Гэтае **нездаваленьне** пачалося амаль адначасна **з падпісаньнем угавору між СССР і Кітаем—першага ўгавору, які прызнае поўны сувэрэнітэт Кітаю і** аснован на поўнай адмове ад спэцыяльных прывілеяў і правоў, якімі карыстаюцца чужаземцы ў Кітаі. У гэтым угаворы імпэрыялісты ўбачылі стымул да разьвіцьця антыімпэрыялістычнага руху. Апошнія падзеі паказалі, што **імпэрыялісты ня хочуць лічыць Кітай роўнаю сабе сувэрэннаю дзяржаваю і ня хочуць дапусьціць адкручваньня кітайскага народу ад імпэрыялістычных краёў.**

Становішча ў Кітаі характарызуецца зараз фактычна ня толькі наліччам грамадзянскае вайны, але **і ўдзелам у гэтай вайне амаль усіх зацікаўленых імпэрыялістычных краёў.** Усяго толькі некалькі м-цаў назад можна было казаць (і прэса сапраўды аб гэтым пісала), што між дзяржавамі няма пагоджанасьці аб інтэрвэнцыі ў Кітаі. Зараз, мне здаецца, можна ўжо сказаць, што **ніякіх «па сутнасьці» разнагалосьсяў у пытаньні аб палітыцы ў Кітаі між імпэрыялістычнымі дзяржавамі няма.**

(Працяг дакладу ў заўтрашнім нумары).

ПРАВАГАМІНДАНАЎСКІ ПЕРАВАРОТ У ПАЎДНЁВА-ЎСХОДНІМ КІТАІ.

Чан-Кай-Шы заснаваў у Нанкіне контр-рэвалюцыйны ўрад.

40.000 імпэрыялістычных войск у Шанхаі.

ЗАХОП ЧАН-КАЙ-ШЫ ЎСІХ ПАЎДНЁВА-ЎСХОДНІХ ПРАВІНЦЫЙ.

ЗАХОП ГЕНЭРАЛАМІ ЧАН-КАЙ-ШЫ ЗАЛАТОГА ЗАПАСУ Ў КАНТОНЕ.

ШАНХАЙ, 18-IV. Пераварот адбыўся ня толькі ў Кантоне, але і на ўсім паўднёвым усходзе—у правінцыях Цзянсу, Цжэцьзян, Фудзьдзян і Гуаньдунь.

Становішча ў Цзянсі і Гуансі нявыразнае; рэшта правінцый на баку Ухана.

Водлуг вестак, нанкінская канфэрэнцыя яшчэ не адчынілася, адбываюцца толькі папярэднія нарады.

Цэнтральны банк у Кантоне разам з залатым запасам у 8 млн. кітайскіх даляраў захоплен Лі-Чы-Шэнам. На чале фінансавага кіраўніцтва Кантона пастаўлен Куін-Фын. Усе службоўцы, назначаныя ў свой час міністрам фінансаў Сун-Цзэ-Вэнам, звольнены, шмат хто арыштаваны. Сун-Цзэ-Вэн яшчэ знаходзіца ў Шанхаі, але ўвесь заснаваны ім у апошні час фінансавы апарат ужо перайшоў да другіх асоб.

Перамовы з шанхайскімі банкірамі аб дачы пазыкі ў 3 млн. даляраў перарваны, бо Сун-Цзэ-Вэн адмовіўся ўзяць на сябе адказнасьць за сумы, **ужо аддадзеныя банкірамі Чан-Кай-Шы,** якія думалі, што ўся пазыка прызначаецца галоўнакамандуючаму. Апрача таго, ня было высьветлена, каму пойдуць новыя ўзносы ў лік пазыкі: Ухану ці Нанкіну:

Апошні крок Сун-Цзэ-Вэна, які настайваў на адзіным кіраваньні фінансамі з Ухана і яго адмова ўзяць удзел у нанкінскай канфэрэнцыі, не зважаючы на неадпольлкавыя запросіны, разглядаюцца шанхайскім друкам, як канчатковы разрыў яго з нанкінскай групай.

Разлад з-за падзелу „цёплых" пасад.

ШАНХАЙ, 18-IV. Між васначальнікамі—удзельнікамі апошняга перавароту ў Шанхаі—ужо ўзьнікаюць сур'ёзныя нелады па пытаньні аб назначэньні на прыбытковыя пасады. Як перадаюць, Бай-Сун-Шы назначае адных, а Чоу-Фын-Чы (камандзір 26 корпусу, які прыбыў у Шанхай з Нанкіну) назначае сваіх кандыдатаў на тыя-ж пасады.

Разгром прафсаюзаў у Сватоу.

НЬЮ-ЁРК, 19-IV. З Шанхаю паведамляецца, што правыя гаміндаўцы напалі на «камуністычныя саюзы» ў Сватоў. У выніку стычкі—шмат ахвяр.

У Шанхаі атрад паўднёвага войска ўчыніў наскок на саюз маракоў.

Чан-Кай-Шы склаў у Нанкіне новы ўрад.

НЬЮ-ЁРК, 19-IV. Шанхайскі карэспандэнт «Асашыэйтэд Прэс» паведамляе, што, водлуг чутак, Чан-Кай-Шы склаў урад у Нанкіне. Падрабязных паведамленьняў аб гэтым няма.

У ШАНХАЙ 40.000 ЧУЖАЗЕМНАГА ВОЙСКА.

ШАНХАЙ, 19-4. **Агульны лік чужаземнага войска ў Шанхаі, водлуг вестак газэт, дасягае 40.000 чал., з іх 20.000 ангельскага войска, 9 тыс. амэрыканскага, 5.000 японскага, 3.000—францускага, і 3.000 гішпанскага, італьянскага, партугальскага і галяндзкага.**

Учора па вуліцах Шанхаю дэманстравала 5 францускіх танкаў, якія прыехалі ўчора-ж.

НАПЯРЭДАДНІ ВЯЛІКІХ ПАДЗЕЙ У ХАНЬКОУ.

НЬЮ-ЁРК, 19-IV. Агэнцтва «Асашыэйтэд Прэс» падкрэсьлівае ўзмоцненае згуртаваньне вайскова-марскіх сіл на Яцзы. У Ханькоу знаходзіцца 36 чужаземных суднаў.

Агэнцтва лічыць магчымым, што ў раёне Ханькоу ў блізкай будучыне **разгорнуцца важныя падзеі.**

Японская эскадра ў Дайрэне.

ХАРБІН, 18-IV. 10 красавіка ў Дайрэн прыбыла японская эскадра ў 28 вымпелаў.

Процікамуністычная літаратура.

ШАНХАЙ, 18-4. Кітайскія купцы на тэрыторыі францускае канцэсіі Шанхаю распаўсюджваюць процікамуністычную літаратуру.

Імпэрыялісты не задаволены адказам Чэна.

ЛЁНДАН, 18-IV. Водлуг вестак агэнцтва Рэйтэра, 5 прадстаўнікоў дзяржаў у Пекіне паведамілі свае ўрады, што адказныя ноты Чэна зусім нездавальняючыя.

НЬЮ-ЁРК, 19-IV. Шанхайскі карэспандэнт «Нью-Ёрк Геральд Энд Трыбюн», падсумоўваючы погляды прадстаўнікоў Англіі, Злучаных Штатаў, Японіі і Францыі ў Шанхаі, піша так: «Нацыянальная армія, якая раней была дысцыплінаванаю, у сучасны момант уяўляе з сябе выступіўшую проці чужаземцаў безадказную банду, лідэры якое зьяўляюцца батлейкаю ў руках Масквы і імкнуцца захапіць чужаземную маемасьць.

Чужаземцы ўжо страцілі надзею, што нацыяналісты аб'яднаюць Кітай».

Глыбокі крызіс фінансаў Мукдэну.

ХАРБІН, 18-IV. «Манчжурыя Дэйлі Ньюс» паведамляе, што катастрафічнае зьніжэньне курсу фынпяо выклікае вялікую трывогу сярод рабочага жыхарства Харбіну. Рабочыя патрабуюць, каб ім выплачвалі заработак срэбнымі далярамі. Зьдзелкі ў фынпяо амаль спынены. Мінімум пражытку служачых павялічваецца вельмі хутка, бо па-за біржай за 100 даляраў патрабуюць ужо 1200 фынпяо.

Цэнзура на карэспандэнцыю ў Манчжурыі.

ХАРБІН, 18-IV. У Манчжурыі ўведзена цэнзура на паштовую карэспандэнцыю кітайскіх і расейскіх грамадзян.

За барацьбу з контр-рэвалюцыянэрам Чан-Кай-Шы.

МАСКВА, 18-IV. Ад імя аб'яднанага масавага мітынгу ўсіх членаў Гаміндану і камуністычнага ўнівэрсытэту імя Сун-Ят-Сэна ў Маскве паслана ЦК Гаміндану і нацыянальнаму ўраду ва Ўхан тэлеграма, у якой выказваецца ўпэўненасьць, што ЦК Гаміндану і нацыянальны ўрад будуць рашуча весьці барацьбу з контр-рэвалюцыянэрам Чан-Кай-Шы і яго прыхільнікамі, з дапамогаю рабочых мас і рэвалюцыйных войск.

Папярэднія вынікі праверкі працы
ПА АЖЫЎЛЕНЬНІ СЕЛЬСАВЕТУ І ПРАЦЫ З БЕСПАРТЫЙНЫМ СЯЛЯНСКІМ АКТЫВАМ.
ТЭЗІСЫ ДАКЛАДУ ТАВ. ГАЛАДЗЕДА НА ПАШЫРАНАЙ НАРАДЗЕ ЗАГАДЧЫКАЎ АРГАНІЗАЦЫЙНЫХ АДДЗЕЛАЎ АК КПБ ПА МАТАР'ЯЛАХ ІНСТРУКТАРСКІХ КАМІСІЙ ЦК КП(б)Б.

ЗАЦЬВЕРДЖАНЫ БЮРО ЦК КП(б)Б 2 САКАВІКА 1927 ГОДУ.

Вынікі працы па ажыўленьні саветаў.

А. Дасягненьні ў галіне савецкай дэмакратыі і ўздыму актыўнасьці мас.

1. Пастаўленыя партыяй задачы па ажыўленьні саветаў знаходзяць сваё ажыцьцяўленьне ў практычнай працы мясцовых партарганізацый. Шэраг посьпехаў у гэтай галіне пацьвярджае правільнасьць палітыкі партыі і ўмацоўвае яе плыў на разьвіцьцё шырокай грамадзкасьці навакол ажыцьцяўленьня задач па сацыялістычнаму будаўніцтву.

Актыўнасьць шырокіх мас сялянства ў грамадзкім жыцьці вёскі бязумоўна павялічылася, у параўнаньні з мінулымі гадамі. Пацьвярджаецца гэта,—папершае, фактам павялічэньня процанту выбаршчыкаў, якія прымалі ўдзел у выбарчых сходах пры перавыбарах сельсаветаў 1927 г.: з 43,3 проц. у мінулую кампанію да 44,4 проц. пры апошніх перавыбарах (узятыя данныя па абсьледаваных камісіямі райёнах); падругое, значна павялічылася колькасьць выступленьняў на выбарных сходах; асабліва актыўна высоўваліся і абгаварваліся ўсе высунутыя кандыдатуры ў склад сельсаветаў, прычым, як правіла, захоўваўся паўсюды прынцып пэрсанальнага галасаваньня; патрэцяе пашырыўся ўдзел шырокіх мас сялянства і абгаварэньня правадзімых партыяй і ўладай мерапрыёмстваў.

2. Бясспрэчна і тое, што актыўнасьць мас, якая павялічаецца, усё больш накіроўваецца па напрамку савецкай грамадзкасьці і што ў агульным уздыме актыўнасьці ўзмацняецца актыўнасьць батрацкіх і бядняцкіх пластоў і ўплыў гэтых груп на грамадзкасьць, якая разьвіваецца (актыўнасьць батрацтва ніжэй актыўнасьці беднаты, але яна куды больш мінулых гадоў). Павышэньне батрацка-бядняцкай актыўнасьці сьведчыцца значным павышэньнем удзелу беднаты і батракоў у выбарчых сходах, што пацьвярджаецца большасьцю фактаў з матар'ялаў камісіі. Таксама можна канстатаваць усё большае ўзмацненьне аўтарытэту партыі сярод шырокіх мас сялянства, прыкладам чаму служыць павялічэньне на БССР процанту камуністаў і камсамольцаў у складзе новавыбраных сельсаветаў (ад 18,4 проц. да 21,4 проц. агульны процант камуністаў і камсамольцаў) пры амальноўным зьніжэньні адміністраваньня і камандаваньня з боку сельскіх ячэек. Высоўваемыя ячэйкай кандыдатуры, як правіла, падтрымліваліся масай і праводзіліся ў складзе сельсаветаў, за рэдкім выключэньнем. У шэрагу месц сялянства па ўласнай ініцыятыве патрабавала выбару ў сельсаветы камуністаў: «Дайце камуніста, ён ужо не падвядзе, у яго ня будзе ні сваточ, ні кумоў».

Усе гэтыя факты ў значнай меры тлумачацца паляпшаньнем кіраўніцтва з боку парт'ячэек, а таксама практыкай правядзеньня сходаў беднаты і працы з ёй *).

3. У галіне ўцягненьня мас у абгаварэньне важнейшых мерапрыёмстваў ёсьць значныя дасягненьні ў шэрагу сельсаветаў і райёнаў. Пры чым сходы беднаты адыгралі ў справе ўцягненьня мас немалую роль (на засеўнай кампаніі, падатку, землеўпарадкаваньню і іншым гаспадарчым пытаньням). Апрача таго, гэта ўцягненьне адбывалася праз устанаўленьне практыкі правядзеньня пашыраных пленумаў сельсаветаў і РВК і праз правядзеньне пленумаў сельсаветаў па асобных вёсках (практыка Новасадзкага сельсавету, Новадворскага сельсавету, Менская акруга і інш.). Таксама трэба адзначыць, як станоўчы факт, і тое, што ў адзнаку ад ранейшых гадоў за апошні год ёсьць некаторыя дасягненьні ў разьвіцьці працы камісій сельсаветаў, праз якія, бясспрэчна, уцягваюцца больш шырокія пласты сялянскага актыву ў прапрацоўку асобных пытаньняў. Добры вопыт уцягненьня мас у практычную працу мае Новасадзкі сельсавет праз стварэньне часовых камісій для распрацоўкі асобных пытаньняў, абмяжоўваючыся тэрмінам працы гэтых камісій.

4. Да недахопаў у галіне разьвіцьця дэмакратыі і ўцягненьня мас у абгаварэньне пытаньняў трэба аднесьці наступнае:

Не правяраецца і невыстарчальна наладжваецца праца камісій сельсаветаў. Высоўваемыя на вырашэньне агульнага сходу пытаньні часта загадзя не падрыхтоўваюцца прэзыдыумам сельсавету. Частка пытаньняў, якія патрабуюць папярэдняга абгаварэньня з беднатой, не праводзяцца праз сходы беднаты, вынікам чаго зьяўляецца ў шэрагу выпадкаў ухваленьне сходам пастаноў не ў інтарэсах беднаты. Таксама неабходна адзначыць, што ячэйкамі і райкомамі невыстарчальна выкарыстан беспартыйны сялянскі актыў пры правядзеньні выбарчай кампаніі.

5. У адзнаку ад шэрагу дасягненьняў у масавай працы сельсаветаў, трэба адзначыць абсалютную руціну ў **грамадзкай** працы каапэрацыйных арганізацый.

У большасьці выпадкаў у праўленьні каапэратываў працуе толькі старшыня праўленьня. У значнай частцы каапэратываў пасяджэньні праўленьня амаль не склікаюцца, а калі склікаюцца, дык вельмі неакуратна. Шэраг важнейшых пытаньняў каапэратыўнага будаўніцтва і працы каапэратыву вырашаюцца або самым старшынёй, або толькі праўленьнем, не ўцягваючы ў абгаварэньне пытаньняў шырокіх пластоў (хоць-бы актыву) пайшчыкаў. Напрыклад, праўленьнем каапэратываў (у абсьледаваных камісіямі райёнах) зусім не разьвіта грамадзкасьць навакол пытаньняў па зьніжэньні розьнічных цэн, каапэраваньня сялянства і г. д. Справаздача перад пайшчыкамі вельмі слабая. Важнейшае пытаньне ў правядзеньні льготнага (за рахунак спэцыяльнага фонду) каапэраваньня беднаты дазваляецца многімі каапэратыўнымі праўленьнямі бюракратычна, габінэтна і фармальна, без арганізацыі навокал гэтага важнейшага пытаньня шырокай грамадзкасьці. Грамадзкая і культурна-асьветная праца каапэрацыяй вядзецца слаба. З дасягненьняў у галіне каапэрацыйнай працы можна адзначыць значны рост пайшчыкаў, што, галоўным чынам, тлумачыцца матывамі эканамічнага характару, але ніяк не разьвіцьцём грамадзкай працы з боку каапэрацыйных органаў. Слаба пастаўлена інструктаваньне каапэрацыйнай нізоўкі з боку каапэрацыйных цэнтраў (акруговых і цэнтральных).

Б. Праверка зьместу працы сельсаветаў.

За апошні год значна палепшыўся зьмест працы абсьледаваных сельсаветаў і адпаведных РВК-аў. Прыкладам гэтаму можа служыць, папершае, тое, што многія сельсаветы ў асноўным змаглі згуртаваць сваю ўвагу на пытаньнях гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Лёзунг партыі аб тым, каб зварачаць больш увагі пытаньням гаспадарчага будаўніцтва, многімі райвыканкомамі і сельсаветамі ўсьвядомлен і на справе праводзіцца ў жыцьцё. Аднак, у настановах сельсаветаў больш за ўсё адбіваецца ініцыятыва па гаспадарчаму будаўніцтву, якая выходзіць з райённых цэнтраў і невыстарчаюча выкарыстоўваецца ініцыятыва самых сялянскіх масаў, якая ў цалым шэрагу выпадкаў выяўляецца ў шырокіх разьмерах. Напр., у некаторых сельсаветах маюцца значныя посьпехі ў разьвіцьці ініцыятывы шырокіх масаў сялянства і выкарыстаньне сялянскай самадзейнасьці на гаспадарчаму і культурнаму будаўніцтву: рамонт дарог, рамонт і пабудова мастоў, пабудова школ на сродкі самаго насельніцтва (Лясноўшчанскі сельсавет, Бабруйскай акругі і Новасадзкі сельсавет, Менскай акругі), пабудова грамадзкіх лазьняў і інш.

У большасьці абсьледаваных сельсаветаў праца бязумоўна вядзецца з пункту гледжаньня ўзадаволеньня інтарэсаў беднаты і серадняку. Гэта можна прасачыць на працы многіх сельсаветаў па разьмеркаваньні сенажаць, на падатку, землеўпарадкаваньні, разьмеркаваньні леса і г. д. дзе шэраг сельсаветаў вядзе сваю працу з пункту гледжаньня ўзмацненьня бядняцка-серадняцкага блёку.

У многіх месцах на грунце разьвіцьця гаспадарчай самадзейнасьці насельніцтва пашырасьцца праца па арганізацыі розных галін сельска-гаспадарчай каапэрацыі: малочныя таварыствы, крэдытныя, мэліярацыйныя і інш.

Побач з дасягненьнямі, якія мы маем у зьмесьце працы многіх сельсаветаў, маецца яшчэ цэлы шэраг кепскіх прыкладаў, калі нават пры наліччы спрыяючых умоў праца сельсаветаў не наладжана. Напрыклад, Станькаўскі сельсавет (Койданаўскі райён, Менскай акругі) незалежна ад наліччя ў райёне сельсавету колькасна вялікіх партыйных і камсамольскіх ячэек (25 чал парт'ячэйка і 95 чал. камсамола), а таксама наліччя значных кадраў культурных працаўнікоў, сельсавет не наладзіў працы як па зьместу, так і па разьвіцьці грамадзкасьці навакол працы сельсавету. Прычынай гэтаму служыць, зразумела, слабае кіраўніцтва сельска-гаспадарчай працай з боку партыйнай ячэйкі і слабая праца сельсавету над выкарыстоўваньнем магчымасьцяў, якія маюцца для ўзмацненьня сваёй дзейнасьці.

3. Эканамічная праца каапэрацыі таксама мае шэраг дасягненьняў. Амаль што ва ўсіх абсьледаваных каапэратывах гэтыя дасягненьні вызначаюцца ў павялічэньні зваротаў (Новасёлкаўскае спажывецкае таварыства павялічыла свае звароты з 1821 руб. да 5682 р. у месяц), у павялічэньні ўласных капіталаў (Самахвалавіцкае спажывецкае таварыства павялічыла капіталы на 14 проц.), у шэрагу выпадкаў зьніжаны цэны за апошняе паўгодзьдзе, а таксама ёсьць некаторыя посьпехі ў справе спрашчэньня накладных выдаткаў. Аднак, усе гэтыя дасягненьні зьяўляюцца вынікам толькі габінэтнай працы па дырэктывах зьверху без разьвіцьця навакол дзейнасьці каапэрацыйных таварыстваў шырокай сялянскай грамадзкасьці, вынікам чаго зьяўляюцца тыя абставіны, што ў працы шэрагу каапэратываў замазваецца клясавы напрамак.

*) Аднак апошняй выбарчай кампаніі у сучасных выводах выяўляецца папярэдні і кароткай (адносіна толькі да абсьледаваных райёнаў), бо ў бліжэйшы час пытаньне будзе спэцыяльна распрацавана і абгаворана ў ЦК КПБ па матар'ялах усіх акруг.

В. Арганізацыйная пастаноўка працы.

1. У галіне пастаноўкі арганізацыйнае працы сельсаветаў ужо маюцца добрыя ўзоры, якія абавязковы да перасяленьня ў іншыя райёны і акругі. Напрыклад, Лясковічаўскі сельсавет (Бабруйская акруга) і Навасадзкі савет (Менская акруга) працуюць па добра распрацаваных плянах, разьбітых па-квартальна і памесячна з устанаўленьнем календарных тэрмінаў выкананьня. У плянах працы бязумоўна прадугледжаны важнейшыя пытаньні гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, а таксама пытаньні грамадзкае працы.

2. Парадак падрыхтоўкі пытаньняў старшынёй да пасяджэньня прэзыдыуму і прэзыдыумаў да пленуму сельсаветаў 1 да агульных сходаў у значнай частцы з абсьледаваных сельсаветаў пачаў практыкавацца, вынікам чаго зьяўляецца ўхваленьне ў такіх выпадках канкрэтных і дзелавых пастаноў, вельмі часта з адзначэньнем тэрміну выкананьня тае ці іншае пастановы. Бязумоўна, пры такой пастаноўцы працы прапрацоўка ўсіх вырашаемых пытаньняў праводзіцца з выстартаючай сур'ёзнасьцю.

3. Праверка выкананьня пастаноў, як правіла, не ўвайшла ў практыку працы і вельмі часта ўхваленыя канкрэтныя пастановы не праводзяцца да канца ў жыцьцё, за выключэньнем некаторых с.-с-таў (2-3 абсьледаваных), якія час ад часу пачалі правяраць выкананьне сваіх пастаноў. Праверка адбываецца наступным парадкам: папершае, пэрыядычна заслухоўваюць справаздачы асобных членаў сельсаветаў, якім даручана правядзеньне ў жыцьцё таго ці іншага пытаньня; падругое, шляхам заслухоўваньня дакладаў камісій сельсаветаў і часовых камісій і толькі ў малай ступені праводзіцца праверка ў парадку выкананьня пляну працы.

4. Слаба наглядаецца інструктаваньне і дапамога з боку сельсавета ў выкананьні даручанай працы мала разьвітымі членамі с.-савету, галоўным парадкам з беднаты, батракоў і жанчын. Інструктаваньне сельсаветаў з боку акрвыканкомаў і райвыканкомаў ажыцьцяўляецца слаба. Кароткатэрміновы выезд асобных членаў РВК'ў на месцы не заўсёды дае патрэбныя вынікі. У шэрагу выпадкаў РВК'і практыкуюць выклік старшыні сельсавету ў РВК для дакладаў і атрыманьня адпаведных зазначэньняў, што, зразумела, не папаўняе поўнасьцю недахопаў інструктаваньня сельсаветаў і ў асаблівасьці не вырашае пытаньня аб пастаноўцы інструктаваньня і дапамогі ў працы малападрыхтаваным членам сельсаветаў. Такім чынам, абавязковае ўзмацненьне інструктарскай працы РВК і АВК зьяўляецца важнейшай задачай, якая стаіць перад імі.

5. Побач з невыстарчальным жывым інструктаваньнем у той-жа час наглядаецца надмерная нагрузка сельсаветаў пісьмовымі абежнікамі прычым абежнікі паўтараюцца па некалькі разоў. Як напрыклад, сельсаветы рэгулярна атрымоўваюць бюлетэні СНКБ, у якіх друкуюцца важнейшыя дырэктывы ўсіх ведамстваў і ў той жа час тыя-ж абежнікі прысылаюцца ў адбітках з РВК. Пры чым РВК, як правіла, атрымоўваемы ім з акрвыканкому абежнік аўтаматычна перадрукаваўшы, пасылае сельсаветам. Бясспрэчна, трэба рашуча скараціць усю «циркулярщину», бо гэта перагружае працу сельсаветаў і нічога практычна не дае.

Побач з гэтым наглядаюцца і такія выпадкі, калі асобныя прадстаўнікамі цэнтральных і акруговых устаноў пры іх выездах на месцы праводзіцца праца ў вёсках ня толькі па дапасаваньню з сельсаветамі (што абавязкова для ўсіх ведамстваў), але таксама і бяз ведама апошняга. У значнай меры прыпыняецца і без патрэбы, са шкодай для жывой працы, ускладняецца праца сельсаветаў перагрузкай розначага рода справаздачамі і абавязковым дабаўленьнем вялікай колькасьці статыстычных данных. Кожнае ведамства патрабуе вестак па свайму напрамку і гэта ўсё прыпыняе жывую працу сельсаветаў і бязмерна перагружае яго працаўнікоў. Трэба рашуча адмовіцца ад такой практыкі і заснаваць больш практычны парадак атрыманьня патрэбных вестак. Скараціць патрабаваньні справаздачы ад сельсаветаў, больш устанавіць жывое інструктаваньне і дапамогі ім у працы.

6. З масавых грамадзкіх арганізацый асабліва зьвяртае на сябе ўвагу арганізацыйная праца каапэрацыі і камітэту сялянскага таварыства ўзаемадапамогі. Каапэрацыйныя арганізацыі ў абсалютнай большасьці ня толькі не падрыхтоўваюць, але і не праводзяць шэрагу пытаньняў праз адпаведныя выбарчыя органы, а вырашаюцца адзіноасобна. У моц гэтага і абгаварваемыя пытаньні на агульных сходах пайшчыкаў не атрымоўваюць канкрэтнага вырашэньня, а ўхваляюцца агульныя пастановы, якія нічога ня кажуць.

7. Камітэты сялянскай узаемадапамогі ва ўсіх абсьледаваных мясцох, за невялікім выключэньнем, працуюць кепска. Адсутнічае грамадзкасьць у іх працы.

Падбору працаўнікоў не зьвяртаецца належнай увагі ні з боку ячэек, ні з боку райкомаў і таму працаўнікі камітэтаў сялянскай узаемадапамогі ў большасьці выпадкаў слабыя. Часткова прычына яшчэ складаецца з таго, што працаўнікі камітэтаў сялянскай узаемадапамогі вельмі кепска аплачваюцца. Пасяджэньні КСУ праводзяцца нерэгулярна, і часта важнейшыя гаспадарчыя пытаньні праводзяцца адзіноасобна старшынёй, таму шмат нараканьняў з боку насельніцтва за няправільнае разьмеркаваньне ўсемагчымых палёгкаў сярод асобных сацыяльных груп сялянства.

Інструктаваньне і кіраўніцтва праца з боку райённых КСУ вельмі слабае. Пытаньне аб ажыўленьні і ўзмацненьні дзейнасьці камітэтаў узаемадапамогі павінна стаць перад усімі акругкомамі, райкомамі і сельячэйкамі, як адна з важнейшых задач. Тым больш, што цэлы шэраг эканамічных мерапрыемстваў дзяржавы па аказаньню дапамогі беднаце пакіроўваюцца праз КСУ, не гаворачы ўжо аб тым, што іх задача складаецца і ў разьвіцьці грамадзкай ініцыятывы для аказаньня дапамогі беднаце.

У мэтах ажыўленьня працы КСУ і ў мэтах неабходнасьці прыцягненьня ўвагі да іх працы ўсіх партарганізацый і шырокай грамадзкасьці аддзелу друку ЦК і ЦК КСУ абвяльціць у газэтах агляд і конкурс на лепшую працу сельскага камітэта сялянскай узаемадапамогі.

8. З іншых грамадзкіх масавых арганізацый найбольш актыўна выяўляюць сваю дзейнасьць сельска-гаспадарчыя гурткі, праца якіх у шэрагу выпадкаў прыцягвае ўвагу шырокіх пластоў сялянства. Пры умелай пастаноўцы працы сельска-гаспадарчыя гурткі могуць быць (у шэрагу месц ужо зьяўляюцца) аспоўнымі арганізацыямі масавай агрупрапаганды сярод сялянства. З няменшай актыўнасьцю працуюць дзелегацкія сходы, пры чым гэта форма працы сярод сялянак умацоўваецца, як аснаўная форма масавай працы. Неабходна адзначыць, што праца па вылучэньню кадраў актывістак сялянак, якія маглі-б пры дапамозе кіраўнікоў праводзіць дзелегацкія сходы,—вядзецца невыстарчальна. Праца ячэек «Прэч няпісьменнасьць», МОПР'а, Таварыства дапамогі абароне, Авіяхіма невыстарчальна кіруюцца з боку ячэек і адпаведных райённых цэнтраў, хоць грунт для разгортваньня іх дзейнасьці ёсьць (наліччa членаў гэтых арганізацый у кожным сельсавеце). Ёсьць дасканалыя ўзоры, якія неабходна, як правіла, перанесьці ў іншыя райёны і акругі—выданьне насьценных газэт (Навасадзкі с.-с. Менскай акругі). Навокал насьценных газэт у данным сельсавеце групуюцца лепшыя з сялянскага актыву. Апроч таго, праз насьценную газэту грамадзкая думка значна ўплывае на выпраўленьне недахопаў, якія ёсьць у працы сельскіх арганізацый. Аднак, неабходна адзначыць, што ў шэрагу месц камуністы слаба бяруць удзел у працы насьценных газэт і ячэйкі яшчэ невыстарчальна зьвяртаюць увагі кіраўніцтву насьценных газэт.

9. Сходы беднаты па ўсіх абсьледаваных райёнах праводзяцца па ўсіх важнейшых пытаньнях і ня толькі ў зьвязку з перавыбарнымі кампаніямі, але і пры правядзеньні рознага рода эканамічных мерапрыёмстваў, што значна дапамагае і забясьпечвае правядзеньне курса па ўзмацненьні клясавага напрамку ў працы і ўмацаваньні бядняцка-серадняцкага блёку.

У адзнаку ад мінулага году ўдалося куды больш прыцягнуць на с оды беднаты, батрацтва і сельска-гаспадарчых рабочых, але ўсё-ж актыўнасьць батракоў на сходах беднаты ніжэй актыўнасьці беднякоў. Аднак, неабходна адзначыць, што ў асобных ячэйках і райённых партарганізацыях праца з беднатой мае нядбайны характар, што выражаецца ў слабай падрыхтоўцы пытаньня да сходаў беднаты, ва ўстанаўленьні большага размаху ў працы бяз вучота магчымасьцяй абслугоўваньня сходаў, не наладжаны яшчэ вучот і праверка праводзімай працы і ў шэрагу выпадкаў не наладжаны яшчэ вучот і праверка з беднатой. Вопыту працы груп беднаты яшчэ зусім няма, бо апошнія пачалі арганізоўвацца (споўна па) толькі ў апошнюю перавыбарчую кампанію сельсаветаў. Таму, побач з прадаўжэньнем практыкі правядзеньня сходаў беднаты, партарганізацыям неабходна зьвярнуць максымальную ўвагу пастаноўцы працы груп беднаты.

Г. Партыйна-пралетарскае кіраўніцтва.

1. Партыйнае кіраўніцтва працай сельсаветаў і іншых арганізацый ажыцьцяўляецца ў большасьці выпадкаў праз асобных камуністаў, якія працуюць у адпаведных арганізацыях, фракцыі сельсаветаў, праўленьнях каапэратываў і г. д. у шэрагу выпадкаў немагчыма арганізаваць з-за недахопу сапраўдных членаў партыі. У такіх выпадках трэба ўстановіць практыку нарад камуністаў, кандыдатаў і камсамольцаў.

2. Кіраўніцтва парт'ячэек значна палепшылася, але побач з палепшаньнем ёсьць яшчэ шэраг выпадкаў выяўленьня хвасьцізму, зьмяшэньня функцый ячэйкі і сельсавета. Апроч таго, ёсьць выпадкі, калі ячэйкай і сельсаветам на адным і тым-жа месцы ня ведаюць пытаньні, якія ўхваляюцца пеадпаведнымі пастановы, якія ня ўхваляюцца агульнымі пастановамі, якія ня ведаюць.

Адсутнічае ня веданьне, а ўхваляюцца пастановы, якія ня ведаюць.

3. Кіраўніцтва працай сельсаветаў і іншых арганізацый ажыцьцяўляецца ў большасьці выпадкаў праз асобных камуністаў, якія працуюць у адпаведных арганізацыях, фракцыі сельсаветаў, праўленьнях каапэратываў і г. д. у шэрагу выпадкаў немагчыма арганізаваць з-за недахопу сапраўдных членаў партыі. У такіх выпадках трэба ўстановіць практыку нарад камуністаў, кандыдатаў і камсамольцаў.

2. Кіраўніцтва парт'ячэек значна палепшылася, але побач з палепшаньнем ёсьць яшчэ шэраг выпадкаў выяўленьня хвасьцізму, зьмяшэньня функцый ячэйкі і сельсавета. Апроч таго, ёсьць выпадкі, калі ячэйкай і сельсаветам на адным і тым-жа месцы ня ведаюць пытаньні, якія ўхваляюцца пеадпаведнымі пастановы

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

ПЛЕНУМ ЦК УсеКП(б).

МАСКВА, 18-IV. 13-16 красавіка г.г. адбываўся пленум ЦК УсеКП(б) з удзелам членаў прэзыдыуму ЦКК і членаў рэвізійнае камісіі. Пленум абгаварыў шэраг пытаньняў, зьвязаных са зьездамі саветаў РСФСР і СССР. Заслухаўшы і абгаварыўшы паведамленьне палітбюро аб пастановах, ухваленых ім у зьвязку з апошнімі міжнароднымі падзеямі (падзеі ў Кітаі і інш.), пленум ухваліў палітыку палітбюро па міжнародным пытаньні.

Пленум пастанавіў склікаць 15-ы зьезд УсеКП(б) у другой палове лістапада г. г. і даручыў палітбюро падаць на разгляд наступнага пленуму парадак дня зьезду.

Пленум заслухаў таксама паведамленьне бюро камфракцыі ЎЦСПС аб апошнім пасяджэньні англа-савецкага камітэту адзінства ў Берліне.

Прырост прамысловае прадукцыі.

МАСКВА, 18-IV. Водлуг даных цэнтральнага аддзелу статыстыкі ВСНГ СССР, большасьць галін прамысловасьці далі ў сакавіку значны прырост прадукцыі проці лютага. Агульны разьмер вытворчасьці павялічыўся за справаздачны месяц на 4,5 проц. Падагуленьні вытворчасьці за мінулыя паўгода, даюць прырост у параўнаньні з аднаведным перыядам леташняга году на 29,9 проц. Рост сакавікоўскіх зваротаў вышэй зваротаў мін. году.

10-ЦІГАДОВЫ ЮБІЛЕЙ ПРАВІНЦЫЯЛЬНАЕ БАЛЬШАВІЦКАЕ ГАЗЭТЫ.

ДНЕПРАПЯТРОЎСК, 18-IV. Учора адна з старэйшых правінцыяльных бальшавіцкіх газэт «Звезда» адсьвяткавала 10 гадовы юбілей. Газэта атрымала шмат прывітаньняў. «Звезде» паднесен чырвоны сьцяг ад рабочых заводу імя Пятроўскага, рабочых дэпо і сэкцыі працаўнікоў друку.

КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЬЦЬ КНЯЗЯ ДАЎГАРУКАВА Ў СССР.

Даўгарукаў зараз арыштаваны ў Харкаве.

ХАРКАЎ, 18-IV. Наконт арышту ў Харкаве ранейшага князя Паўла Зьміт-рава Даўгарукава, які ў дарэвалюцыйны час Расеі быў адным з правадыроў кадэцкае партыі, старшыня ДПУ Баліцкі сказаў карэспандэнту Ратау:

«У лістападзе 1917 году Даўгарукаў быў арыштаваны ў Петраградзе, але ўцёк, і, як актыўны вораг савецкае ўлады, дэкрэтам СНК абвешчан пазаконам.

У парыжы Даўгарукаў прайшоў у таксаны «нацыянальны камітэт». Летам 1924 г. ён перайшоў савецкую граніцу з боку Польшчы і, затрыманы савецкаю пагранічнаю вартаю, назваў сябе фальшывым прозьвішчам. З СССР Даўгарукаву ўдалося хутка ўцячы за граніцу.

У чэрвені 1926 году Даўгарукаў другі раз прабраўся ў СССР, перайшоўшы савецкую граніцу з боку Румыніі. Пазьней арыштаваны Даўгарукаў пасьля доўгіх адмоў паведаміў, што, знаходзячыся на савецкай тэрыторыі, ён вёў перапіску з «нацыянальным камітэтам», у якой зазначыў, што насыўнасьць шкодна, што неабходна арганізаваць антыбальшавіцкія элемэнты, асабліва афіцэрства і ў патрэбны момант, у часе ўзброенае стычкі СССР з Захадам, ударыць у тыл. Між іншым Даўгарукаў лічыў неабходным пасылку актыўных афіцэраў з эміграцыі ў СССР. Адна з задач эміграцыі, водлуг яго слоў, складаецца з таго, каб арганізаваць праз прэсу грамадзкую думку Заходняе Эўропы проці СССР.

Даўгарукаў лічыць, што адзінаю актыўнаю формаю барацьбы з саветамі зьяўляецца палітычная і эканамічная блёкада.

Пасьля пераходу граніцы Даўгарукаў прыехаў у Харкаў, дзе распачаў сувязь з сваімі старымі знаёмымі па земскай, думскай і кадэцкай дзейнасьці. Даўгарукаў спрабаваў тут распачаць практычнае выкананьне сваіх плянаў, стварэньне арганізацыі па сыстэме пяцёрак і ўжыў усе захады да заснаваньня тайнае «пяцёркі» з сваіх харкаўскіх прыяцеляў. Аднак нават ранейшыя прыяцелі Даўгарукава па кадэцкай партыі не пайшлі на гэта.

У канцы трэба зазначыць, што ў эміграцыкай прэсе пядаўна зьмяшчаліся артыкулы з надрабязнасьцямі «зьверскага растрэлу» Даўгарукава. Гэтыя артыкулы выклікалі толькі ўсьмешку ў самога Даўгарукава, які ў сучасны момант сядзіць у ДПУ.

РОСТ МІЖНАРОДНАЕ САЛІДАРНАСЬЦІ РАБОЧЫХ.

Збліжэньне між асьветнікамі СССР і Эўропы.

17-га красавіка ў Маскву прыехала экскурсія латвійскіх настаўнікаў у складзе 8 чалавек. На чале дэлегацыі — дырэктар рыскае гарадзкое гімназіі Бэрз.

У Капэнгагене адчынілася выстаўка савецкае адзінае працоўнае школы.

Нарвэскія гарбары просяць падтрыманьня ў рабочых СССР.

МАСКВА, 18-IV. ЦК саюзу гарбароў СССР атрымаў ад нарвэскага саюзу па вырабу абутку ліст з просьбаю аказаць грашовую дапамогу, бо перамовы з прадпрыемцамі, якія настайваюць на зьніжэньні заработку, ні да чаго не прывялі і барацьба ня спыняецца.

ЦК гарбароў тэлеграфна перавёў лёкаўтаваным нарвэскім рабочым на вырабе абутку ў выглядзе першага ўзносу 5.000 руб.

Прыезд у Маскву дэлегацыі нарвэскіх прафсаюзаў.

18-га красавіка прыехала ў Маскву дэлегацыя рады прафсаюзаў Нарвэгіі ў складзе т.т. Эдэгорда (прадстаўнік некваліфікаваных рабочых шляхавае гаспадаркі і горнае прамысловасьці) і Іёнсона (прадстаўнік саюзу рабочых хімічнае прамысловасьці). Мэта прыезду—асьвятленьне перад УЦСПС становішча 27—28.000 лёкаўтаваных рабочых Нарвэгіі для падачы ім неабходнага падтрыманьня.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ.

Вялічэзны разьліў Місісіпі.

НЬЮ-ЁРК, 15-IV. Разьводзьдзе рэчкі Місісіпі і яе прытокаў учыніле вялікія страты. Шмат людзей затанула. Новы Арлеан часткаю затоплен.

Адначасна з разводзьдзем наглядаецца і другая стыхійная навала: у штатах Масачузэтс, Нью-Хэмпшыр і Нью-Ёрк выбухнулі лясныя пажары.

У Савецкай Беларусі.

Правядзеньне нацыянальнае палітыкі.

Беларусізацыя ў Барысаўшчыне.

Зараз акрнацкамісія закончыла сваю працу па праверцы беларусізацыі ўстаноў. Вынікі праверкі наступныя: усяго праверана 1042 чал., з якіх—добра ведаюць мову—9,19 проц., здавальняюча—39,34 проц., ня зусім здавальняюча—9,56 проц., слаба—28,68 проц. і зусім ня ведаюць—13,23 проц. Трэба адзначыць, што процант добра ведаючых і здавальняючых—павялічыўся (у мінулым годзе—добра ведаючых зусім ня было). Процант беларусізацыі ўстаноў—таксама ўзрос на 20-30 проц. і зараз Акрана вядзе сваю працу цалкам на беларускай мове, АВК—на 95 проц., Акрза—70 проц., Акрміліцыя—90 проц., Акрфа—70 проц., райвыканкомы—на 50-90 проц., сельсаветы—на 20-90 проц. Ёсьць і такія ўстановы, як: Акрэдраў, Статбюро, Дзяржстрах і Дзяржбанк, якія беларусізаваліся толькі на 5-10 проц., але згодна дырэктыў акрнацкамісіі, усе ўстановы сур'ёзна ўзяліся за справу беларусізацыі і вывучаюць беларускую мову на курсах, якія арганізаваны як у горадзе, так і ў райёнах.

Як недахват, трэба адзначыць тое, амаль ва ўсіх установах гутарка вядзецца ў большасьці на расейскай мове. На гэта самым кіраўніком аддзелаў трэба зьвярнуць больш увагі.

Што-ж тычыцца нашых барысаўскіх чыгуначнікаў, дык там адміністрацыя зусім нічога не зрабіла ў гэтым напрамку. Ня гледзячы на тое, што ў іх маецца загад аб неабходнасьці веданьня беларускай мовы, для адказу на запытаньні і прыёму тэлеграм на гэтай мове, яны мовы зусім ня ведаюць, лічачы, што справа беларусізацыі да іх зусім ня тычыцца. А начальнік станцыі ўжо ў другі раз не зьвяўся на пасяджэньне нацкамісіі для дакладу аб беларусізацыі апарату, ня гледзячы на своечасовае папярэджаньне. Акрнацкамісіяй пастаўлена пытаньне перад прэзыдыумам АВК аб прыцягненьні да адказнасьці адміністратараў станцыі «Барысаў» за няўку. Цэнтральнай нацкамісіі таксама трэба зьвярнуць увагу ўнаўнаважанага чыгункі пры СНК БССР аб выкананьні дырэктыў на чыгунцы падлеглымі ўстановамі.

Сманцар.

„Сьляпыя бачаць".

(М. Пухавічы, Менскай акругі).

У нашым мястэчку да апошняга часу застаецца шмат бедноты, якая прымушана шукаць сродкаў к жыцьцю рознай наёмнай працай. Дзеці гэтае беднаты ў якасьці пастушкоў, батрачкоў і нянек расходзяцца з вясны па хутарох і ваколіцах аж да «Кузьмы-Дзямяна», альбо нават да «Піліпаўкі». Варочаюцца гэтыя дзеці якраз у тую пару, калі школы бываюць запоўнены вучнямі, свабодных мейсц там няма, і яны застаюцца па-за школай, стваравочы кантынгэнт няпісьменнага адсталага элемэнту.

У дарэвалюцыйныя часы ніхто на гэты «элемэнт» не зьвяртаў увагі, і ён складаў значны процант у агульным ліку насельніцтва.

Сёлета пры сямігодцы для пераросткаў з гэтае беднаты быў адчынен лікпункт, які забясьпечваўся пісьмовымі прыладамі і асьвятленьнем ячэйкай «Прэч няпісьменнасьць». Вельмі ахвотна і акуратна наведвалі яго падросткі, затое і вынікі атрыманы добрыя.

12-га красавіка былі зроблены калёквіумы, на якіх выявілася, што некаторыя з вучняў надта бойка ўмеюць чытаць, прыгожа і скора пісаць і лічыць. Адным чынам, далучыліся да сьвядомай працоўнай сям'і тыя, якія раней, як «падонкі» грамады, былі «ні богу сьвечкай, ні чорту качаргой». 18 чалавек, з якіх 11 дзяўчат, атрымалі пасьведчаньні аб зьліквідаваньні сваёй няпісьменнасьці і шчыра дзякавалі савецкай уладзе, дапамогшай ім стаць «роўнымі сярод людзей».

Гэты прыклад карысьці таварыства «Прэч няпісьменнасьць» вельмі яскрава сьведчыць сярод тых, дзеля каго яно існуе і каго з кожным годам тысячамі ўцягвае ў свае шэрагі.

К.

З-за бюракратызму лясьнічага.

(Вёска В.-Крушынаўка, Рагачэўскага р., Бабруйшчына).

У 1925 годзе сяляне нашай вёскі пачалі хадатайнічаць перад Наркамземам аб абмене сенажацяў, якія знаходзяцца ў Ціхініцкім лясьніцтве. Справа ў тым, што сенажаць (балотная) нашай вёскі разьмешчана ў лесе за 18 вёрст, а такі-ж кусок сенажаці знаходзіцца ў паўвярсьце ад вёскі.

Наркамзем справу накіраваў ў л-ва, даў сваю згоду аб такім абмене. Лясьніцтва выехала на месца ў 1926 г., абгледзіла сенажаць і згадзілася на абмен. Аставалася толькі л-ву прадаць некалькі жардзін, якія знаходзяцца на абмене.

Але вось з-за гэтых 1.000жардзей і вядзецца валакіта па гэты дзень. Л-ва меркавала прадаць іх сялянам, але жэрдкі кепскай якасьці, ніхто іх ня купіў, сэзон кончыўся і такім чынам абмен не зацьверджан. Сяляне ўжо сабіраліся карчаваць гэту сенажаць, але справа яшчэ ня вырашана.

Трэба належным органам пасунуць гэту справу як мага хутчэй.

Я. М. Савіцкі.

ВЕСТКІ З МЕСЦ.

Дом беспрацоўных.

Гомель. 15 красавіка адчыніўся дом беспрацоўных. У гэты дом будуць накіроўвацца беспрацоўныя, ня маючыя прытулку. Кожны беспрацоўны мае права жыць у доме ня больш 7 сутак.

Перападрыхтоўка настаўніцтва.

Рэчыца. З 1 чэрвеня па 15 ліпеня будуць праведзены пасьцідыпёвыя курсы беларусазнаўства, разлічаныя на 60 настаўнікаў. На курсах будзе выкладацца беларуская мова, гісторыя беларускай культуры, беларуская літаратура і г. д.

Шэфская праца на вёсцы.

(Ліст з Віцебшчыны).

Шэфскімі арганізацыямі горада Віцебску за прайшоўшую зіму шмат што зроблена ў вёсках.

Усе арганізацыі шэфствуюць над 60 сельсаветамі, з якіх над 33 шэфствуюць рабочыя і над іншымі служачыя, студэнты і інш.

Усе шэфы вывучылі добра свае вёскі і сувязь з імі значна ўзмацнілася. Вёска ведае свайго шэфа, чакае яго прыезду.

За гэты час зроблены 181 выезд: 7 выездаў з кіно-карцінамі, 7 са спэктаклямі і 106 з дакладамі.

Паслана 150 лістоў, атрымана 97 адказаў.

Некаторыя шэфы практыкавалі запрашэньне сялян у горад, дзе знаёмілі іх з бытам і жыцьцём рабочых, з іх вытворчасьцю.

У падшэфныя вёскі выпісваецца 222 экз. розных газэт, 22 экз. сельска-гаспадарчых часопісаў, 92 экз. інш. часопісаў і інш. Заслана за паўгода 1.126 с.-г. кніг, 784 палітычных кніг, 79 справачнікаў, 82 санітарна-гігіенічныя кнігі, 162 ваенныя, 338 белетрыстыкі, 300 дзіцячых, 73 вучэбныя кнігі і г. д. Усяго заслана 5.494 кнігі.

Акрамя гэтага, на сродкі вобчества «Культымычка» утрымоўваецца ў падшэфных вёсках: 10 чырвоных куткоў, 6 хат-чытален, 5 розных куткоў пры пардомах, 11 лікпунктаў, 5 гурткоў, 3 школы кройкі і шыцьця.

Адрамантавана 7 хат-чытальняў і пардомаў, пераплецена 1000 кніг, пастаўлены 2 радыё-прыёмнікі, 3 летнія дзіцячыя пляцоўкі і г. д.

Акрамя культурна-асьветнай працы шэфаў у вёсцы, імі ўсямерна аказвалася і арганізацыйна-гаспадарчая дапамога сялянству.

Яшчэ да 1-га студзеня г.г. (ад жніўня 1926 г.) шэфы вёсцы паслалі 4 веялкі, 3 малатарні, 3 сарціроўкі, 14 плугоў, 4 бараны, 2 пажарныя машыны і інш.

Некаторыя шэфскія арганізацыі нават удзельнічалі ў арганізацыі каапэратыўных таварыстваў, грамадзкіх ячэек і інш.

Так, напрыклад, арганізавана 6 каапэратываў, 5 пракатных пунктаў, зроблена матар'яльная і арганізацыйная дапамога 6 каапэратывам.

Усё гэта гаворыць аб тым, што шэфскія арганізацыі зьяўляюцца памоцнікамі ў культурным арганізацыйным становішчы вёскі і пабуджаюць сялян к самадзейнасьці.

У апошні час сяляне самі пачалі арганізоўваць чырвоныя куткі, выпісваць газэты і часопісы, адчыняць хаты-чытальні, арганізоўваць розныя т-вы, па сродкі самаабложэньня сталі утрымоўваць загадчыкаў хат-чытален, ўзмацняць КСУ, каапэраваць бядняцкія гаспадаркі, арганізоўваць школы кройкі і жыцьця і г. д.

Прапаганда аб новым спосабе землякарыстаньня гэтаксама дае свае вынікі. Сяляне пераходзяць на шматпольле.

А Ч.

Асіповіцкая „электрастанцыя".

(Асіповічы, Бабруйшчына).

Асіповіцкая чыгуначная электрастанцыя зьяўляецца рэдкасьцю: сядзяць там «кустары» па электрычнасьці, ламаюць машыны і пілюць нэрвы ў людзей. Увечары ў некаторых хатах гарыць газавая лямпа і электрычн. лямпачка, прычым, дапаўненьнем зьяўляецца электр. лямпачка да газавай, а не наадварот, бо з яе такі сьвет—хоць у жмуркі гуляй.

Радуешся: правёў электрычнасьць, будзе сьвятло, можна працаваць... А яно на вечар на разоў 20 гасьне. А то зьявяцца да цябе тыя, што рабілі праводку і кажуць:

«У вас праводка папсавана—трэба зьмяніць!» (мо' трэба, а мо' і ня трэба—чорт яго ведае!). Гэта патрабуе нямала грошай! бо, бачыце, яны працуюць, як кажуць!—у няўрочны час да і за гэта самі сабе стаўкі вызначаюць—2, 3 і 5 рублёў ад лямпачкі. Але-ж нічога не паробіш—і плаціш, і зьмяняюць, каб праз год зноў ім заплаціць (трэба-ж і ім зарабіць).

Па суботах і нядзелях дык сьвятла і не чакай: ідзе кіно, якое забірае амаль што ўсю энэргію са станцыі,—хаця якая гэта станцыя—гэта будзе хутчэй разьезд, які яшчэ трэба ў дадатак зачыніць з-за рэжыму эканоміі, або высьліць адтуль «кустарнікаў» і пасадзіць ведаючых людзей.

Нэрвы ў людзей хутка парвуцца,—і тады бяда будзе.

Ампер.

Нарада загадчыкаў акруговых зямельных аддзелаў.

Аб льготах па с.-г. падатку на 1927-78 год.—Пасяўная кампанія сёл. году.—Рэарганізацыя акруговых і райённых зямельных органаў.

10 і 11 красавіка ў Менску адбылася нарада загадчыкаў акруговых зямельных аддзелаў.

Нарада была склікана для абгаварэньня пытаньняў аб льготах па сельска-гаспадарчаму падатку на 1927-28 г., аб ходзе работ па правядзеньню пасяўной кампаніі і аб рэарганізацыі акруговых і раённых зямельных органаў.

Нарада выказалася за ўнясеньне некаторых дадаткаў да дэкрэту аб сельска-гаспадарчым падатку, якія у асноўных выяўляюцца ў наступным: ад сельска-гаспадарчага падатку павінны быць вызвалены пасевы, маючыя паказальнае значэньне, і пасевы, якія знаходзяцца ў веданьні інстытуту сялян-дасьледчыкаў; гэтаксама ад падатку павінны быць вызвалены прыбыткі ад навукова-паказальных пасек, якія знаходзяцца ў веданьні зямельных органаў, пасевы кармавых кораньплодаў (буракоў, бручкі, кармавых буракоў і морквы на палявым кліну), вікі, лубіну (на палявым кліну) і канюшыны поўнасьцю.

Нарада прызнала, што па прыкладу мінулага году мінімум абкладаньня прыбытку ад садоўніцтва і гародніцтва павінен быць наступны: для садоў і гародаў у сельскіх мясцовасьцях—1/2 дз., у горадзе 1/10 дзес.

У адносінах абкладаньня пчалярства нарада прызнала патрэбным даць акрвыканкомам права поўнага вызваленьня ад сельска-гаспадарчага падатку пчалярства ў райёнах, ня маючага прамысловага значэньня, і ўстанаўленьня мінімуму абкладаньня 10 вульлёў.

Дзеля спрошчаньня афармленьня па атрыманьні льгот нарада выказалася за замену выдачы пасьведчаньняў райвыканкомамі сельскімі падатковымі камісіямі.

Далей, нарада прызнала, што 49 арт. дэкрэту аб сельска-гаспадарчым падатку павінен быць даполнены пашырэньнем льгот па неабкладаньню племянных жарабцоў, прызнаных гэткімі зямельнымі органамі, племянных бараноў, якія знаходзяцца ў грамадзкіх злучных пунктах, пітомнікаў сьвіней у сельскіх гаспадарках, пітомнікаў буйнае рагатае жывёлы.

Пасьля заслуханьня дакладу аб ходзе работ па правядзеньню сельска-гаспадарчай кампаніі і шырокім абмене думкамі па гэтаму пытаньню, нарада прыняла рэзалюцыю, у якой пастаноўлена давесьці да ведама ўраду, што задавальненьне пасяўнымі матар'яламі Цэнтраземскладам і Белсельсаюзам поўнасьцю ў тэрмін ня выканана. Загадчыкам акруговых зямельных аддзелаў даручана да 15 красавіка праверыць завоз усяго збожжа, вучот і сысканьне сэлекцыйнага насеньня, разданага камітэтамі сялянскае ўзаемадапамогі, паставіць перад акрвыканкомамі пытаньне аб забраніваньні аўса, які паступае на адрас Хлебапрадукту, у выпадку годнасьці яго для пасеву. У рэзалюцыі адзначана слабая работа камітэтаў сялянскае ўзаемадапамогі ў справе правядзеньня загатоўкі пасеваў для беднаты.

Па пытаньню аб рэарганізацыі акруговых і райённых зямельных органаў нарада выказалася за тое, каб акруговыя апараты гэтых органаў засталіся аддзеламі акрвыканкомаў з захаваньнем за імі, апрача функцый плянаваньня, рэгуляваньня і інструктаваньня, таксама апэрацыйных і адміністрацыйных у галіне работы па мэліярацыі, земляўпарадкаваньні і лясной гаспадарцы. Дзеля ўмацаваньня апарату, скарачэньня адміністрацыйнага складу і большай адказнасьці апэрацыйных работнікаў за работу, якую яны выконваюць, прызнана, каб структура акруговых зямельных аддзелаў будавалася на прынцыпу функцыянальнае сыстэмы праз замену нададзелаў інструктарамі і інспэктарамі і непасрэднага падпарадкаваньня апошніх загадчыкаў акруговага зямельнага аддзелу. Народнаму Камісарыяту Земляробства даручана пераапрацаваць палажэньне аб ім, ужываючы яго ў новых функцыях апарату зьверху да нізу, выходзячы з таго, што гэтым мы прыбліжаем яго да шырокіх мас сялянскага насяленьня і спрошчаньня прахаджэньня розных спраў. Маючы на ўвазе недахват спэцыялістаў, пастаноўлена ўзяць цьвёрды курс на падрыхтоўку курсантаў з сялянства па розных галінах сельскага і лясного будаўніцтва, скарыстоўваючы іх для работы ў сваіх вёсках пад кіраўніцтвам райённых спэцыялістаў.

Канцэлярскую работу апошніх прызнана патрэбным перадаць адміністрацыйнаму складу зямельнае часткі райвыканкому для забясьпечаньня магчымасьці правядзеньня спэцыялістымі асноўнае работы.

І. Фрыдман.

Беларускі Вэтэрынарны Інстытут.

(Гутарка з рэктарам Інстытуту праф. Яўг. Піл. Алонавым).

З прычыны недахвату вэтэрынарных дактароў, сялянства БССР штогод мае страты ад надзяжу скаціны ў сярэднім ад 3-х да 5-ці мільёнаў руб. Заснаваньне Беларускага Дзяржаўнага вэтэрынарнага інстытуту ў Віцебску зьяўляецца ўвасабленьнем культурна-эканамічнага збліжэньня савецкага ўраду з рабоча-сялянскімі масамі.

Інстытут знаходзіцца ў стадыі арганізацыі—працуюць ужо 3 курсы. Дзейнічаюць клінікі—прапэдэўтычная і капытных хвароб. Маюць быць пабудаваны клінікі: хірургічная, тэрапэўтычная, інфэкцыйная і клініка дробнае жывёлы.

На ўсіх 3-х курсах навучаецца 310 студэнтаў. З іх—65 проц. бяднейшых сялян, 8 проц. рабочых і 28 проц. нізавых служачых вёскі. 38 проц. усяго складу студэнцтва складаюць партыйцы.

Пры інстытуце існуюць паўторныя курсы для вэтэрынарных фэльчароў, якія маюць сваёй мэтай, з аднаго боку, павысіць кваліфікацыю нізавых вэтэрынарных працаўнікоў, а з другога боку—даць магчымасьць паступіць у інстытут вэтэрынарным фэльчарам. Дзякуючы курсам, мелі магчымасьць паступіць у інстытут за 2 гады 12 фэльчароў.

У 1926-27 навучальным годзе пры інстытуце адчыніўся вячэрні рабфак, на якім вядзецца выкладаньне па праграме з біолёга-вэтэрынарным ухілам.

Навукова-дасьледчая праца інстытуту вядзецца па паасобных катэдрах пераважна з краязнаўчым ухілам. Чарговай сваёй працай інстытут ставіць задачай вывучэньне эпізоотычных хваробаў, распаўсюджаных у межах БССР, як—красноха і чума сьвіней, сібірская язва і інш., і скласьці геаграфічную карту эпізоотычных хваробаў, распаўсюджаных у БССР; інстытут мяркуе, што гэта вывучэньне ў далейшым дасьць магчымасьць палепшыць мэтады змаганьня з эпізоотыяй і будзе магчымасьць больш плянава расходаваць розныя прышчэпкі.

Ін-тут выдае навукова-практычную часопісь—«Беларуская вэтэрынарыя». У часопісі зьмяшчаюцца навуковыя працы супрацоўнікаў інстытуту і розныя працы па практычнай вэтэрынарыі вучасткавых дактароў.

— Мы спадзяёмся,—кажа праф. Алонаў,—што пасьля шэрагу выпускаў інстытуту, якія пачнуцца з 1928 г., беларускія сяляне будуць рэальна адчуваць у сваіх гаспадарках працу Беларускага вэтэрынарнага інстытуту.

Больш увагі факультэту права і гаспадаркі.

Два гады існаваньня факультэту права і гаспадаркі даюць ужо магчымасьць зрабіць вынікі аб яго дзейнасьці, а таксама выявіць недахопы ў яго працы і зьвярнуць на гэтыя недахопы грамадзкую ўвагу.

Перш за ўсё трэба адзначыць, што факультэт аформіўся, як вышэйшая навучальная ўстанова. Распрацованыя навучальныя пляны ні чым ня горшыя, чым пляны Вузаў іншых рэспублік. Шэраг катэдраў абслугоўваюцца выдатнымі прафэсарамі і дацэнтамі.

Адмоўнымі бакамі навучальных плянаў трэба прызнаць адсутнасьць выстарчаючай спэцыялізацыі курсаў, што неабходна для абслугоўваньня эканамістамі розных галін народнай гаспадаркі БССР.

Калі мэтавая ўстаноўка юрыдычнага аддзяленьня зусім зразумела, як рыхтуючая кваліфікаваных юрыстаў, то ня зусім зразумела, каго рыхтуе эканамічнае аддзяленьне. Сама назва скончыўшых «эканаміст» яшчэ нічога ня гаворыць. Праўда, факультэт з III курсу мяркуе 3 спэцыяльныя цыклы: адміністрацыйна-прамысловы, гандлёва-каапэрацыйны і банкава-грашовы, але і гэты падзел вельмі шырокі.

Адсутнасьць выразнай мэтавай установкі для эканом-аддзяленьня тлумачыцца з аднаго боку адсутнасьцю да яго ўвагі з боку мясцовых эканамічных органаў і з другога недахопам прафэсароў і выкладчыкаў. У той час, як уваходзячы ў склад дэканату Наркам'юст прымае актыўны ўдзел у працы факультэту, прадстаўнік гаспадарчых органаў тав. Лысоў, за ўвесь год прысутнічаў на пасяджэньні факультэту толькі адзін раз. На зварот факультэта да ВСНГБ аб дачы ўказаньня, каго эканом-аддзяленьне павінна рыхтаваць, адна афіцыйная асоба заявіла літаральна наступнае: «каго хочаце, таго і рыхтуйце, і калі хто небудзь з патрэбных нам пойдзецца сярод вас, то мы яго возьмем».

Прафэсура едзе да нас вельмі туга, бо дрэнна аплачваецца.

Трэба адначасова сказаць і аб невыстарчальным разуменьні іншымі адказнымі працаўнікамі задач і мэтаў факультэту. У той час, як на мэдычны і інш. факультэты даюцца неабходныя сродкі, мы ня бачым такіх адносін да факультэту права і гаспадаркі. Водпуск нават і нязначных сродкаў робіцца хаотычна і звычайна ў канцы навучальнага году.

На факультэт права і гаспадаркі трэба зьвярнуць належную ўвагу партыйным і савецкім органам. Факультэт, які рыхтуе будучых будаўнікоў сацыялістычнай гаспадаркі, ня можа быць у такім становішчы, у якім ён зараз знаходзіцца. Стараньнем толькі аднаго дэканату са студэнцтвам, пры адсутнасьці грамадзкай увагі, мы повага кадру неабходных нам працаўнікоў мець ня будзем.

М. Баран.

Наб сваячасова і акуратна атрымлівэць
У МАІ МЕСЯЦЫ
газ. „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ",

А. ЯСНЫ.

Пад шэрым небам.

I.

— Вось у нас людзі адукаваныя пашлі, вось дзе вучоны чалавек, вось культура!—сеў гэта, «панімаеце-лі», сабе ў цяньку пад кустом з кніжкаю ды азіраецца на ўсе бакі ці глядзяць людзі, што ён чытаць умее,—качаў чарговы нумар свае вусмас газэты шаноўны абываталь Завальля Тодар Сілыч Паперкін.

Гэтае Завальле было звычайным глухім беларускім мястэчкам з нескалькімі вуліцамі, на галоўнай з якіх коні таніліся ў гразі кожную вясну і восень. «Тратуары» мелі асабістую здольнасьць біць фантанам амаль ня ў нос кожнаму, хто адважваўся на іх хадзіць.

Жыцьцё прахадзіла ў Завальлі так ціха, і аднатонна, як у стаячым балоце, але гэтак было раней, цяпер—не, ужо ня тое. Моцны імпэт сучаснага жыцьця закрануў і яго, што адразу дало некаторыя вынікі і з'явіўся самародны тэатр, калідэратыў, дзе між іншым прачаваў Паперкін; урэшце пошта, так што нават началі заходзіць і газэты, якіх ня было там ад існаваньня сьвету.

Паперкін, хаця лічыў сабе чалавекам «прагрэсыўным», ня надта прыхільна адносіўся да гэтага апошняга з'явішча на прычынах можа агульнага, а можа і чыста асабістага характару, і хоць і чытаў іх зрэдку, каб быць «у курсе дзела», але ўсё-ж такі заўсёды меў да іх нейкую непрыхільнасьць, ну, адным словам, ён ня любіў іх.

Затое ён надта любіў пацяшаць жонку сваімі ўласнымі апавяданьнямі і амаль кожны дзень, вярнуўшыся са службы, расказваў ёй аб якім-небудзь цікавым здарэньні, але іх было ў Завальлі ня надта і гэта давала яму магчымасьць разьвіваць талент сваёй творчай фантазіі.

Яго жонка, Дар'я Кірылаўна, ня гналася за вскам, а жыла сабе проста, сваімі асабістымі інтарэсамі.

Газэт яна, пэўна, ніколі і ў рукі ня брала, бо на свайму-жа шчыраму прызнаньню, яна мала разумела з гэтага «глупства», але-ж як уважліва, з якою цікавасьцю яна слухала апавяданьні свайго гаспадара, хаця і ведала, што яны не абыходзіліся біз хлусьні.

Толькі сёньня нешта яна была, як кажуць, не ў настроі: ці ёй не спадабалася тое, што яе муж не заўважыў на высокую, худую, з бегаючымі зьнімі вачамі кабету, што сядзела ў пакоі, ці проста хацела на-табе вочы на лоб павылязалі, ня бачыш, што ў мяне госьця сядзіць?..

— Ну, ну, чаго ты, расхадзілася—спакойна, вінаватым голасам адказаў ён. Выбачайце, мадам Брахалкіна, калі-ж, панімаеце, такі чалавек, аж злосьць разьбірае, ну як маецеся, як...

— Чаго ты, Сілыч, наехаў ужо няма ведама куды? ну кажы-ж, хто гэта там такі, ну!—вось паглядзеце, пані Брахалкіна, што гэта за чалавек!

— Праўда, праўда—вось і папаліся, Тодар Сілыч, папаліся! ага, ура каго-ж вы гэта гаварылі?

— А, цікавасьць гэта жаночая, за прабачэньнем,—ну да ён жа, гэты, ах... ён сын, ну дабрэйшы суседа наш, і каб, панімаеце, з гэтым сваім цялячым розумам, каб, ён, кажу, хоць чытаць умеў...

— Да чаго ты пляцеш, які сусед? Хунтовіч?

— Ну, а хто-ж ты думала, панімаеце-лі, ён, гэты самы і акуляры сабе на нос, панімаеце-лі, начапіў яшчэ, ну як вам надабасьцца, мадам Брахалкіна?

— О, ён заўсёды корчыць з сябе інтэлігэнта! А вы чулі?—яго сын прыехаў, той што студэнтам; жаніўся, з жонкаю, значыць, ды на яўрэйцы, кажуць, але нішто сабе, харошанькая.

— Ну ды што вы кажаце! гэтага быць ня можа, каб рускі чалавек ды на яўрэйцы жаніўся, панімаеце-лі—з запікаўленасьцю ў голасе адазваўся Тодар Сілыч.

— Як ня можа быць? я-ж вам кажу, ня хто-небудзь, а я сама, сваімі ўласнымі вачыма, значыць, не бачыла, а вы кажаце, ня можа быць.

— Ат, слухайце вы толькі яго, што ён скажа, гэты дурань! вы бачылі? і харошанькая?—запыталася Дар'я Кірылаўна.

— Нічаво сабе, адным словам, кажу вам, харошанькая, носік такі сабе тоненькі, значэ-лі, маленькі; высокая і, са стану пішчаватая—прынялася размалёўваць новую грамадзянку Завальля «мадам» Брахалкіна.

Яна была, як казалі ў Завальлі, «пантафлёваю поштай», гэта значыць, выконвала ролю местачковага радыё, прычым яна ня толькі распаўсюджвала, але і сама складала навіны, запраўляючы іх дзеля большага смаку мешанінаю хлусьні і насьмешкаў.

Яе муж казаў калісь з гордасьцю сваім знаёмым:

— Калі хочаце разьнесьці па ўсім мястэчку якую-небудзь вестку, то расказжыце яе маёй жонцы і толькі напрасеце яе пасьля ня гаварыць. Пабачыце, што цераз наогул Брахалкіна жанчына з вялікімі здольнасьцямі—але вось у жыцьці бываюць з'явішчы ня зусім зразумелыя: ну што, здаецца, можа быць лягчэй, як мець здольную жонку, а Брахалкіну дык нешта не падабалася. Кінуў яе і паехаў некуды. Казалі, што ня мог ужыцца з гэткаю бабай. А яна хоць бы што! Устроілася сабе на службу і жыла ня горш, як і за ім, а калі яе кранала якое скарэчэньне, ці звальняді адкуль [бо яна была баба трошкі сварлівая], яна ўсюды лазіла і прасіла, пакуль не дабівалася свайго. Адным словам, яна была з ліку тых людзей, якія самі аб сабе кажуць, што яны «умеюць жыць».

Цяпер, седзячы ў Паперкіных, яна бачыла, што здолела зацікавіць іх абодных свайго навінай і самаздавольная ўсьмешка пакінула ад яе роту аж да вушэй.

— Ай, што вы кажаце?—пачаў зьдзіўлена Паперкін—такі на яўрэйцы жаніўся, так такі, панімаеце-лі, і ўсамдзеле на яўрэйцы, вось так штука! на табе, бацька, пацеху над старасьцю! хаця яму, панімаеце-лі, так і трэба мешчаніну гэтаму, гэта-ж фанабэрыі, панімаеце-лі, дык як у пана; добра, добра, так яму і трэба, толькі што ўстоі сямейныя, устоі, панімаеце-лі, таго. Вось маладыя цяпер! Н-да, вось вам і дзяда на сьвеце пашлі!—

уздыхнуў Тодар Сілыч.

— Ды будзе табе ўжо! Не дасі і пагаманіць нават—абурылася на яго жонка—дык і харошанькая, вы кажаце? Скажыце пажалуста! Я заўсёды свайму кажу, што ён правхвост такі, як і бацька, вось вам і Хунтовіч!—на яўрэйцы, а можа яшчэ і багатая?

— Ну, а то што-ж вы думаеце, так то ня надта хто і возьме, вось як маю Лілю; га! Не такі ён дурань! Але носік, носік дык проста „восхіцительны".

— Хаця ён, здаецца, так нічога чалавек малады?

— Ды ён то нішто хлапец, але бацька... Кажуць-жа, ён тады проста ўцёк з дому.

— А гэта тыш! ён-жа і сам скупы, а яна дык, кажуць, яшчэ горшая.

— О, яна, яна! Вы можа

Спажыўцу--танны тавар.

У справу зьніжэньня цэн уцягваецца грамадзкасьць.—З прастоямі вагонаў трэба павесьці самую рашучую барацьбу.--Кошт утрыманьня каапэрацыйнага апарату яшчэ трэба зьніжаць.—Каапэрацыя Віцебшчыны ў зьніжэньні цэн мае пэўныя дасягненьні.

„За грошы ад прастою вагонаў можна было-б пабудаваць палац.“.

Са старонак нашых газэт ня сходзяць допісы рабкораў аб тых недарэчнасьцях, якія адбіваюцца на зьніжэньні цэн.

Як ні зьніжаюць нашы гандлюючыя арганізацыі накладныя выдаткі, а ўсё-ж яшчэ зроблена зусім мала.

Я хачу спыніцца на тых накладных выдатках, без якіх можна зусім абыйсьціся,—гэта аплата (і я бы сказаў не маленькая) за прастой вагонаў.

За прыкладамі далёка хадзіць ня прыдзецца. У адрас Барысаўскага ЦРК прыходзіць 2 вагоны мукі, з іх адзін стаіць 27 дзён, а другі—29. Ну, і прыпалося заплаціць за прастой больш 500 руб. Другі прыклад. Наш ЦРК выпісвае вагон шкла і за прастой плаціць звыш 260 руб., а само шкло каштавала каля 1000 руб. Падлічыце, колькі процантаў накладных выдаткаў.

Выпісвае адна з барысаўскіх арганізацый салому ня то з Украіны, ня то яшчэ адкуль і, урэшце, за прастой плаціць 700 руб. Здаецца, уся салома гэтага не каштавала.

А колькі нераплачваюць нашы фабрыкі і заводы,—аб гэтым пісалася ўжо ня раз. Адзін «Домбаль» за прастой вагонаў з пяском заплаціў, відаць, не адну тысячу рублёў.

Цікава прывесьці словы кіраўніка чыгуначнай таварнай канторы, які сказаў:

— **«Кабы нам дазволілі скарыстаць усе тыя сродкі, якія выплачваюцца толькі ў Барысаве за прастой вагонаў, дык мы пабудавалі-б вялікі пышны палац».**

На вялікі жаль, вельмі цяжка вынесьці на сьвет недарэчнасьці з прастоямі вагонаў, бо кіраўнік таварнай канторы рашуча адмаўляецца падзяліцца гэтымі зьвесткамі.

Неабходна Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі заглянуць у гэты куток і вывесьці, каго трэба, «на чыстую ваду», або дазволіць дапішчыкам газэт карыстацца гэтым матар'ялам дзеля высьвятленьня ўсіх недарэчнасьцяў, якія ўносяць перашкоды ў працу па зьніжэньню цэн.

В. Зайцаў.

Правяраем зьніжэньне цэн.

(Бабруйшчына).

Як мага зьнізіць цэны на тавары, удасканаліць і рацыяналізаваць гандлёвы апарат, пазбавіцца лішніх выдаткаў, вось што у наступны момант зьяўляецца асабліва важнай задачай палітыкі партыі і савецкай улады. Правесьці зьніжэньне цэн так, каб яно ўва ўсёй паўнаце дакацілася да сялянства.

І вось на гэтаму акруговы саюз спажывецкіх таварыстваў сумесна з газэтаю «Камуніст» праводзіць гандлёва-грамадзкі агляд спажывецкіх таварыстваў у справе зьніжэньня цэн.

Праз газэту, як акруговы саюз спажывецкіх таварыстваў, так і асобныя спажывецкія таварыствы вызначаных да абгляду райёнаў даюць шырокую справаздачу сваім спажыўцам і, наогул, усяму насельніцтву аб той працы, якая праведзена імі ў галіне зьніжэньня цэн.

Пасьля справаздач спажывецкіх таварыстваў гэта пытаньне паступіць на шырокае абгаварэньне сялянскіх мас праз газэту.

Апрача таго, па райёнах праводзяцца агульныя сходы пайшчыкаў спажывецкіх таварыстваў па пытаньні зьніжэньня цэн. У гэтых сходах прымаюць удзел прадстаўнікі акрсаюзу спажывецкіх таварыстваў і рэдакцыі газэты «Камуніст».

Няма сумненьняў, што гэтыя сходы і грамадзка-гандлёвы агляд працы спажывецкіх таварыстваў выявіць запраўднае становішча цэн у нізавой сетцы спажывецкай каапэрацыі.

Гэтымі мерапрыёмствамі само сялянства ўцягнецца ў працу па зьніжэньню цэн і дасьць сваю думку аб тым, наколькі правідлова па мясцох праводзіцца праца ў галіне прыбліжэньня тавараў да спажыўца, наколькі вялікія хібы яшчэ ў гэтай галіне ў нашых спажывецкіх таварыствах на мясцох. Бязумоўна, тут сялянства выкажа сваю думку аб тым, як у далейшым праводзіць працу, каб сапраўды зьнізіць цэны на тавары, удзешавіць каапэрацыйны апарат, і тым прыблізіць нашу каапэрацыю да сялянства.

Можна спадзявацца, што задачы, якія паставіў перад сабою гандлёва-грамадзкі агляд працы каапэрацыі на вёсцы, будуць выкананы цалкам.

А. Дамброўскі.

Дзяржаўная ўстанова ці прыватная крамка?

(Койданова, Меншчына).

У сакавіку месяцы адна жанчына пайшла ў Койданаўскую аптэку купіць скрыначку фасфаціну, за што яна заплаціла 2 р. 25 к. 10 красавіка гэтая самая жанчына была ў Менску і зайшла ў першую савецкую аптэку і папрасіла скрыначку фасфаціну, за што з яе напрасілі 1 р. 10 к. Учуўшы гэтакую дзяшоўку, жанчына спытала: «чаму яно гэтак падзешавала з 2 р. 25 к. на 1 р. 10 к.». У адказе ёй сказалі, што яно так і каштавала.

Прыехаўшы да хаты, жанчына пайшла ў Койданаўскую аптэку, каб высьветліць, чаму з яе так дорага ўзялі на 1 р. і 15 к. даражэй чым у Менску. Калі загадчык аптэкі пачуў гэтыя словы запраз-жа ўзяў 1 р. 15 к. і вярнуў жанчыне.

Я думаю, што гэтае пытаньне трэба высьветліць, бо гэта ма' быць, ня першы раз, калі бываюць такія здарэньні. Былі выпадкі, калі шмат запрашваюць і пачынаюць таргавацца, як у прыватных гандляроў, і спускаюць на палову цаны, што запрасілі. Трэба належнай установе зьвярнуць на гэта належную ўвагу.

Знаёмы.

„ЗЬНІЖЭНЬНЕ“ ЦЭН У МЦРК.

(На сходзе ўпаўнаважаных).

— Скажы, браце, ты, здаецца, заўчора быў на сходзе ўпаўнаважных ЦРК?

— Быў і паслухаўся, аж вушы вянуць!

— Ну, аб чым там гаварылі? Здаецца, у абвестцы, якую я чытаў у газэце, там павінны былі гутарыць аб зьніжэньні цэн на тавары...

— Гаварылі, браце, але ўсё «в общем и целом», а, наогул кажучы, дык я добра і ня ўцяміў, дзе там общее», а дзе «целое».

— Ну, а што казала наша праўленьне?

— Праўленьне праз свябра т. Вольфсона казала, што яно зрабіла ўсё, каб зьнізіць цэны і ўжо ёсьць дасягненьні. Зьніжана ад 1 да 2 проц., але ёсьць шмат перашкодаў, як влякі кантроль з боку ўстаноў і арганізацый так і праклятыя загадчыкі крамаў якія, ня гледзячы на тое, што тавар і прадукты расцэньваюцца на рублі і капейкі з «паловай», бяруць толькі «цэлымі», чаму зьніжэньня найпшчык не адчувае. Таксама шмат папсаваў уласны транспарт які, дзякуй богу, ужо зьнішчылі, а справу дастаўкі тавару перадалі прыватніку па паўтары капейкі з пуда—пакуль што на 6 месяцаў, а далей мо' заплацім і даражэй.

— Ну, а як наконт чаргі ў крамах, асартымэнту тавару?

— І аб гэтым размова была. Казалі, што чарга ўжо памяншаецца таму, што пайшчык-рабочы, не даўпёсшы некалькіх капеек да другога паю, хоць і стаіць у чарзе па тры гадзіны сорак хвілін, каб атрымаць паўкілё селядцоў, але мы яму не выдаём, чаму, прастаяўшы такі час, у другі раз ён больш ня пойдзе; апрача гэтага, каб справіцца з тым, хто ўнёс пай цалкам і поўнасьцю, дзеля іх зробім скарачэньне асабовага штату, толькі не ў праўленьні, а ў крамах, пакінуўшы там па адному загадчыку, да якога ніхто ня пойдзе, баючыся чаргі, і чарга, такім чынам, будзе зьнішчана. Што датычыцца асартымэнту тавару, то ён значна папышраны: уведзены яйцы, мэбля, малако і бываюць іншы раз шатляндзкія селядцы.

— Ну, а што гаварылася наконт зьніжэньня цэн на прадукты і тавары?

— Яны ўжо зьвізіліся: сала каштуе толькі на 20 проц. даражэй, чым у прыватніка, а галёшы, пры параўнаньні толькі з мінулым годам, пакуль-што каштуюць на 40 кап. даражэй і г. д.

— Ну, а як наконт накідкі на прадукты і тавары?

— Дзякуй богу, ад людзей не адстаём: на фрукты накідаем 45—65 проц., на масла—14 проц. і больш, на абутак і скураныя тавары—каля 15—20 пр.—гэта на тыя, якія атрымоўваем з іншых гарадоў, а на вырабы менскай фабрыкі—5—10 проц. і г. д.

— А чаму-ж ты мне, браце, ні слова не сказаў аб пэраспэктывах, яны, я бачыў стаялі ў павестцы дню?

— Пэрспэктыў «в общем и целом»—колькі хочаш, толькі наша праўленьне пакуль-што не зрабіла на іх расцэнкі, каб можна было зараз-жа правесьці зьніжэньне цэн, чаму да гэтага часу і няма іх на рынку.

— Ну, а што-ж наогул вынесьлі?

— Якога чорта ты адтуль вынесеш, калі нічога. апрача пейкай гатовай паперкі пры ўваходзе больш ня далі, а каб даўжэй сядзелі на сходзе, дык у канцы паказалі кіно.

— Ну, а як, «в общем» и «целом»?

— Адстань! Чаго ты да мяне прывязаўся, не раўнуючы, як упаўнаважаныя ЦРК Бэрнштэйн, Ізак і інш. да тав. Вальфсона за цікавы яго даклад.

Янка Янкавіч.

Блытаюць зьніжэньне цэн.

(Слуцак).

На апошнім пленуме Слуцкага акруговага савету прафсаюзаў асобным пытаньнем быў пастаўлен даклад аб ходзе працы па зьніжэньню цэн ў акрузе.

З дакладам выступілі мяцовыя каапэрацыйныя працаўнікі.

Скардзіліся гэтыя працаўнікі на тое, што ў Слуцкай акрузе, нібыта, цэны на прамтавары нізкія, а на сельска-гаспадарчыя прадукты амаль... недаступныя.

І яшчэ шмат аб чым гаварылі працаўнікі мясцовай каапэрацыі ў сваіх дакладах.

Але вось даклады скончаны.

Слова даецца мясцом.

Перад прысутнымі вырастае зусім іншая карцінка.

Папершае, мануфактурны голад. Случчына адчувае яго раней, чым усе. Адчувае моцна. А віды на будучыну таксама вельмі дрэнныя. Голад цягнецца. Праўда, цану на мануфактуру каапэратары зьнізілі—на 5 проц., але што за карысьць ад гэтага зьніжэньня, калі мануфактуры няма.

Яшчэ горш справа з хлебам. Якасьць яго самая дрэнная. Недарэмна-ж каапэрацыйны хлеб у Слуцку не карыстаецца ніякім аўтарытэтам: усе цягнуцца за хлебам да прыватніка.

Многа гаварылася на гэтым пасяджэньні аб апараце ЦРК. Утрыманьне апарату раней каштавала 5,5 проц. ўсіх выдаткаў, пад націскам яго трохі скарацілі—стаў апарат каштаваць 4,3 проц. Але і гэта дорага. Апарат можна і трэба яшчэ скараціць.

Цікавую гісторыю з макухай расказалі дэлегаты пленуму ў спрэчках па гэтаму дакладу.

Сельсаюз закупляе ільнянае насеньне ў сялян па 1 р. 90 к. за пуд., перапрадае яго заводам—па 2 р. 10 к. Вось і гавары пасьля гэтага аб зьніжэньні цэн.

Сельсаюз зарабляе, завод зарабляе, а цана расьце.

Усё-ж пленум адзначыў шэраг дасягненьняў у галіне зьніжэньня цэн. Напрыклад, соль у каапэратывы зараз паступае адразу з месца здабываньня, і гэта дало магчымасьць зьнізіць яе кошт.

Па гэтаму пытаньню пленум пастанавіў уцягнуць шырокія прафсаюзныя масы ў працу па зьніжэньню цэн шляхам пашырэньня ліку крамных камісій і палепшаньнем якасьці іх працы.

Я. С.

БЕЛКААПСАЮЗ ПАРУШАЕ ДЫРЭКТЫВЫ АБ ЗЬНІЖ. ЦЭН

Па вестках Нар. Кам. Гандлю БССР, Белкаапсаюз, ня гледзячы на пастанову эканамічнай нарады, каб атрымліваць пры адпраўцы транзітам мануфактуры аксаюзам камісійныя ў разьмеры толькі 0,5 проц., да гэтага часу атрымлівае 1,5 пр. У сувязі з гэтым Нар. Кам. Гандлю БССР зьвярнуўся да эканамічнай нарады з просьбай прыцягнуць Белкаапсаюз да адказнасьці і прымусіць яго выконваць пастанову.

ДАСЯГНЕНЬНІ У ЗЬНІЖЭНЬНІ ЦЭН.

(Віцебшчына).

Па сельскай каапэрацыі.

За час кампаніі па зьніжэньню цэн па сельскай сеці спажывецкай каапэрацыі Віцебшчыны цэны на некаторыя тавары зьніжаны ў сярэднім на 11,6 проц.

Па асобных таварах зьніжэньне гэткае: на баваўняна-папяровую мануфактуру—8,7 пр. камвольныя тавары—10 проц., нітки—10 проц., астраханскія селядцы—17 проц. жалезна-скабяныя тавары—ад 5 да 25 проц., воканнае шкло—20 проц.

У Цэрабкопе.

Па лініі рабочай каапэрацыі праведзена наступнае зьніжэньне: на манужактуру—8,5 проц. супроць цэн на 1 лютага; камвольныя тавары—9,4 проц., нітки—10 пр., мука простага памолу—6 проц., абойная мука—13 проц.; пшанічная мука ад 2 да 5 проц; дроны—на 4 руб. (на куб. саж.) воканнае шкло—на 20 к. (на ліст), жалезна-скабяныя тавары—ад 5 да 25 проц. гума-тэхнічныя вырабы—да 5 проц; дошкі—10 проц.; цэгла—15 проц.; мыла—10 пр. электрычныя прылады—10 проц.

У сярэднім па рабочай каапэрацыі зьніжаны цэны на 9,2 проц.

Транспартная каапэрацыя

зьнізіла цэны на паўпроц. чым больш, рабочая.

Характэрна тое, што рабочая каапэрацыя (ЦРК) і швэйная фабрыка «Графінтэрн», не чакаючы загаду зьверху, вырашылі пытаньне аб зьніжэньні звыш 7 проц.

А. Ч.

У цэнтральным савеце ОСО-Авіяхіму.

(З пасяджэньня савету).

На чарговым пасяджэньні цэнтральнага савету ОСО-Авіяхіму быў заслухан даклад аб працы Віцебскага акруговага ОСО-Авіяхіму. Даклад зрабіў адказны сэкратар т. Смолік.

Ён адзначыў, што пасьля злучэньня ОСО і Авіяхіму праца т-ва значна ажывілася. У сучасны момант наглядаецца вялікі рост актыву ў т-ве.

Тав. Смолік спыніўся на працы асобных сэкцый арганізацыі. Спартыўная сэкцыя за апошні год пабудавала два планеры; наогул, планерны спорт у акрузе значна разьвіты, асабліва ім захапляюцца маладыя сябры ОСО-Авіяхіму—піянэры, вучні. Віцебскі акруговы савет т-ва прыняў належныя меры да таго, каб гэта захапленьне планерным спортам замацаваць і дапамагчы яму.

Шырока разгарнула сваю працу і авіяхім-сэкцыя.

Для абслугоўваньня вёсак т-ва мае адну авіяхім-перасоўку, якая за апошнія гады заваявала сабе моцны аўтарытэт сярод сялян.

Перасоўка мае шэраг кіно-фільм са зьместам, прысьвячаным ідэям Авіяхіму.

На Віцебскай акрузе з вялікім посьпехам прайшла кампанія па распаўсюджаньню білетаў 1-ай Авіяхім-лётарэі. Такіх білетаў распаўсюджана звыш 5.000.

У канцы дакладу т. Смолік адзначыў недахваты ў працы т-ва. Галоўны недахват—гэта няжыцьцёвасьць райённых саветаў арганізацыі. Недахват і ў тым, што прафэсыянальныя арганізацыі не заўсёды прыходзяць на дапамогу т-ву. Нават былі такія выпадкі, калі прафсаюзы адмаўляліся адпускаць памяшканьне пад сходы т-ва.

Па дакладу вынесена шэраг канкрэтных прапаноў; неабходна ўзмацніць фінансавае становішча т-ва, зьвярнуць больш увагі на ажыўленьне працы райсаветаў і інш.

Далей, на пасяджэньні быў зацьверджан плян сьвяткаваньня ОСО-Авіяхімам 1-га Мая ў Менску. Па гэтаму пляну 2-га мая ў горадзе будуць наладжаны паказальныя інсцэніроўкі і карнавалы.

Я. С.

ХРОНІКА.

400.000 р. на будаўніцтва новых клюбаў.

Праўленьне Зах. чыгункі пастанавіла адпусьціць 400.000 р. на будаўніцтва новых клюбаў для рабочых-чыгуначнікаў. У першую чаргу клюбы маюць будавацца: на станцыях—Жлобін, Гомель і Унеча. Капітальна будзе адрамантаваны Менскі клюб чыгуначнікаў.

Выстаўка літаратуры аб Кітаі.

У агітпропгабінэце клюбу імя К. Маркса адчынілася выстаўка літаратуры, прысьвечанай Кітаю і кітайскім падзеям.

Выстаўка адчынена штодня ад 6 гадз. увечары (за выключэньнем аўторка).

65 працаўнікоў для дзіцячых ясьляў.

Праз тыдзень заканчваюць сваю працу ўсебеларускія курсы па падрыхтоўцы працаўнікоў для дзіцячых ясьляў.

Курсы маюць выпусьціць 65 новых працаўнікоў для дзіцячых ясьляў.

Новыя экспанаты ў музэі рэвалюцыі.

За апошнія месяцы ў музэй рэвалюцыі БССР паступіла шмат новых каштоўных экспанатаў. Між іншым у музэй перададзены ўсе падарункі, якія зроблены рабочымі і сялянамі VIII Усебел. Зьезду Саветаў.

Выстаўка насьценных газэт.

У чэрвені ў Менску адчыняецца выстаўка насьценных газэт, якія выдаюцца пры нардомах, бібліятэках, клюбах, хатах-чытальнях, чырвоных куткох, школах павышанага тыпу, школах рабочай моладзі, малапісьменных і ліквпунктах Менскай акругі.

За лепшыя насьценныя газэты будуць выдадзены прэміі.

Удзел у выстаўцы прымаюць партыйныя арганізацыі і рэдакцыі менскіх друкаваных газэт, на старонках якіх будуць высьвятляцца вынікі выстаўкі.

Загадчыкі нардамоў, хат-чытальняў, сельсоветы і рэдакцыі насьценгазэт павінны прыслаць не пазьней 20 мая на 1-2 экз. насьценгазэт у Менскі акрпалітасьветы. (Адрас: Менск, Пляц Волі, акрпалітасьветы) або ў габінэт палітасьветпрацаўніка (Ракаўская, 2).

Дзяржаўная дапамога маламоцным льнаводам.

Канчаткова вызначана да водпуску сума ў 100000 р. на дапамогу маламоцным льнаводам.

Грошы атрымлівае Белсельсаюз.

Справаздачная кампанія спажывецкай каапэрацыі.

Праўленьне Белкаапсаюзу запрапанавала акрсаюзам і сваім аддзяленьням правесьці ў працягу мая і чэрвеня справаздачную кампанію аб выніках паўгадовай працы спажывецкіх таварыстваў.

Увага пайпчыкаў на справаздачных сходах будзе зьвернута, галоўным чынам, на зьніжэньне цэн і рацыяналізацыю апарату.

Новы парадак рэгістрацыі на Біржы Працы ня членаў саюзу.

Камітэт Біржы Працы з 11 красавіка г. г. устанавіў новыя правілы для рэгістрацыі на БП грамадзян, якія не зьяўляюцца членамі саюзу.

На вучот прымаюцца: 1) асобы кваліфікаванай працы пры ўмове, калі дакумантамі пацьвердзяць сваю кваліфікацыю з месца ранейшай працы, а таксама, калі дакажуць, што ў апошнім годзе, да рэгістрацыі, на Біржы Працы, працавалі поўны час; 2) асобы некваліфікаванай працы—чорнарабочыя, а таксама канторшчыкі, перапісчыкі, рахункаводы, табельшчыкі, кладоўшчыкі прыказчыкі, санітары—прымаюцца на вучот пры ўмове, калі ў працягу году да рэгістрацыі на Біржы працавалі ня менш 6 месяцаў, 3) падросткі і пераросткі да 21 году, калі яны зьяўляюцца дзяцьмі рабочых і служачых і 4) асобы, якія скончылі спэцыяльныя навучальныя ўстановы—тэхнікумы і прафтэхнічныя школы.

Зьніжэньне цэн і работнікі прылаўка.

Дзеля ўцягненьня работнікаў прылаўка да непасрэднага ўдзелу ў працы па зьніжэньні цэн, бюро сэкцыі гандлёвых служачых ЦК саюзу склікае ў чацьвер, 21 красавіка, у памяшканьні клюбу савецка-гандлёвых служачых агульна-гарадзкі сход работнікаў прылаўка. На гэтым сходзе адбудзецца даклад Наркамгандлю аб мерапрыёмствах, якія праводзяцца па зьніжэньні цэн, і садаклад бюро гандлёвай сэкцыі аб удзеле гандлёвых работнікаў у справе зьніжэньня цэн.

Арганізацыя кіраўніцтва працай калектыўных гаспадарак БССР.

Савнарком СССР мае адпусьціць 10000 р. на ўтварэньне ў БССР спэцыяльнага органу для кіраўніцтва працай беларускіх калектыўных гаспадарак.

Здарэньні.

○ Наглядчык Мазырскага паправучага дому, Раманюк данёс, што ў яго, на дарозе ў г. Калінкавічы, украдзены 170 рублёў і розныя дакументы. Раманюк заявіў падазрэньне на зьняволенага, які з ім ехаў. Дазнаньнем устаноўлена, што крадзяжы не было, а грошы растраціў на п'янства сам Раманюк, які і прыцягнен да адказнасьці.

○ У Бабруйскія крамы ЦРК часта прыходзілі невядомыя грамадзяне і атрымлівалі па фактуры тавары. Крым. Вышук прыняў меры да затрыманьня злачынцаў. У выніку былі затрыманы гр-не Пячонка і Дубрульскі у часе, калі атрымлівалі ў краме ЦРК № 5 тавар на падробленай фактуры.

○ У памяшканьні Інбелкульту 18 красавіка ад неспраўнасьці коміна выбухнуў пажар. Пажар пачаўся ў накоі псыха-тэхнічнай лябараторыі. Пажарныя каманды агонь ліквідавалі. Страты невялікія.

○ У Бабруйскі акр. зем. аддзел на пасаду мэліярата-каморніка быў прыняты гр-н Б. Суярка. Набраўшы ад АЗА і ЦРК крадытаў праз абман, афарыст зьнік. Меры да адшуканьня прыняты.

Эканамічныя навіны.

Барацьбы са „здачай“ цукеркамі і сярнічкамі.

Пар. Кам. Гандлю БССР запрапанаваў усім роз'ячным гандлёвым арганізацыям рабіць рахункі з пакупцамі на аснове акругленьня сумы не да поўных капеек, а да паўкапейкі.

Арганізацыям забараняецца даваць, замест здачы ў поўкапейкі, цукеркі, сярнічкі і г. д., грунтуючыся на тым, што ў касе няма паўкапек.

Вінаватыя ў невыкананьні гэтага загаду будуць прыцягвацца да адказнасьці.

Аб'яднаньне прадстаўніцтваў Гомельшчыны з агульнабеларускімі.

15-га красавіка з Маскоўскай канторай Белкаапсаюзу аб'ядняліся ўсе маскоўскія прадстаўніцтвы спажывецкай каапэрацыі Гомельшчыны.

Павялічэньне збыту беларускіх дражджэй.

У сакавіку рэалізавана 1.000.000 фунтаў беларускіх дражджэй, з яніх: у БССР—15 пр., на Украіне—10 пр., у Ленінградзе—10 пр. у Маскве—15 пр., у Цэнтральна-Прамысловым райёне—25 пр. і ў іншых мясцох СССР—25 пр.

У красавіку прадугледжвацца рэалізаваць 1.500.000 фунтаў.

Выпрацоўка ільнянага алею.

У мінулым годзе заводы Белхарчтрэсту выпрацавалі 660.000 пуд. ільнянага алею. Сёлета прадугледжваецца выпрацаваць 720.000 пуд., што дзякуючы недахвату ільнянага семя, магчыма ня будзе выканана.

Ліквідацыя Кіеўскае Канторы Белкаапсаюзу.

Ліквідавана Кіеўская кантора Белкаапсаюзу. Замест канторы асталёны ўпаўнаважаныя: у Кіеве, Харкаве і Дзяпрапятроўску.

СУД.

Курашанцы «давартаваліся».

Такі лясьнічы, як Зьмітрок Чарняўскі з Курашанскага лясьніцтва, Аршанскае акр., рэдка бывае. Гэта чалавек з „гаспадарскім“ замахам.

— Рубаюць ваколічныя вёскі лес—няхай сабе рубаюць. Натое ён і лес, каб яго рубалі. Да таго-ж, ня варта нажываць сабе ворагаў сярод сялян. Зноў-жа, ляпей узяцца, напрыклад, вартаваць Сяркоўскі завод. Гэтаю справаю і не накрыўдзіш нікога, і прыбытак сякі-такі ёсьць, бо можна атрымаць ад заводу шкло, крэйду і іншыя карысныя рэчы.

Так разважаў Чарняўскі і так рабіў. Калі хто дасьць добрую порцыю „у лапу“—дык усё можна. Тады нават ня толькі лес рубай, але бяры і вывозь і гатовыя, апрацаваныя лесаматар'ялы. У такіх выпадках лясной варты ня толькі ня было патрэбна, але яна аказвалася зусім лішняю.

— Чаму кожны вартаўнік, думаў Чарняўскі,—павінен ведаць, што я раблю?

І вось, каб заняць «з карысьцю» вартаўнікоў, ён пасылаў іх вартаваць Сяркоўскі завод.

— Хто дадумаецца так зрабіць? Адным стролам—двох зайцаў. І тут не перашкодзяць, і там сабе і мне заробяць.

Прыпа аб'ездчыка і вартаўнікоў гэтага лясьніцтва гаварыць ня прыходзіцца. Яны не далёка адышлі ад свайго начальніка.

Аршанскі акруговы суд, разгледзіўшы «справы» гэтых „вартаўнікоў“, прыгаварыў Чарняўскага на 1 год 6 месяц. зьволеньня. Аб'ездчыка Пагарэльскага — на 1 год зьвяноленьня і іншых курашанскіх «вартаўнікоў»—на розныя тэрміны.

С. Азерскі.

Судовая хроніка.

Каапэратары пад судом.

Праўленьне Белявіцкага каапэратыву (Аршанск. акр.) у складзе пяці чалавек сыстэматычна растрачвала каапэрацыйныя грошы. Каапэратараў прыцягнулі да адказнасьці. Аршанскі акруговы суд прыгаварыў іх да году зьняволеньня кожнага.

За падпал.

Аграфена Коркава разьвялася з сваім мужам—не паладзілі.

Даведалася Коркава, што б. яе муж будуе сабе новую хату, і падпаліла яе, але пажар затушылі.

Гомельскі акруговы суд прыгаварыў Коркаву на 6 месяцаў зьняволеньня.

Бандыт-забойца.

Забіў начнога вартаўніка чыгуначнага складу на станцыі Віцебск II. Есьман.

Есьман—бандыт са стажам, і на лаўцы падсудных ён ужо ня першы раз.

Віцебскі акруговы суд прыгаварыў Есьмана на 8 год зьняволеньня.

Бібліяграфія.

„ЧЫРВОНАЯ СЯЛЯНСКАЯ ВЕЧАРЫНКА“.

Зложылі П. Ф. Капаевіч, М. Сяўрук і С. Баркоўскі. Выданьне Галоўпалітасьветы БССР.

Мяняецца быт ня толькі гораду, як асяродку больш культурнай савецкай грамадзкасьці, але навыт жыцьцё прасякае ўжо і ў вёску. Рушацца старыя звычаі і дзедаўскія забабоны, разьвіваюцца, як вецер, рэлігійныя забабоны. Марудна, але ўпарта цягнуцца з зямлі храсткі новай вясковай грамадзкасьці і новага быту.

Зусім слушна, што само жыцьцё вымагае ад нас стварэньня новых забаў для вясковай моладзі, пабудаваных на здаровым грунце.

Маючы на ўвазе гэту мэту, Галоўпалітасьветы выпусьціў кніжку пад назвай „Чырвоная сялянская вечарынка“. У кніжку ўвайшлі лепшыя творы Янкі Купалы, Якуба Коласа, М. Чарота, Бядулі, Гартнага, Крапівы, Вольнага, Александровіча і інш. Поруч з творамі чыста мастацкага і інсцэніроўчага характару, ёсьць творы, якія гавораць аб будаўніцтве сацыялістычнага жыцьця, аб шматпольлі, дэклямацыі і інш.

Значнае месца ў гэтай кніжцы займаюць беларускія сьцены на сучасныя тэмы. Словам, гэтая кніга дапамога вёсцы наладзіць добрую чырвоную вечарынку—у гэтым вялікая каштоўнасьць кнігі.

К. І.

Водгукі на карэспадэнцыі.

На зьмешчаныя ў нашай газэце заметкі—«Зьніжэньне цэн па рацэпту Цэнтраземскладу» і «Л. Васька слушает да est»—(№№ 52 і 71 за 1927 г.) Цэнтраземскład прыслаў матар'ялы, у якіх даводзіць, што цэны Цэнтраземскладу на насеньне дасканала пераглядваны вышэйшымі кантрольнымі органамі—Наркамгандлем,—і Наркамземам,—і ніякіх няправільнасьцяў у цэнах на гародніе насеньне няма.

Што датычыцца «градацыі» цэн на дробныя порцыі—параўнаўча з вялікімі дык Цэнтраземскład тлумачыць гэта «специфическими особенностями семенной торговли», якая вымушае Цэнтраземскад кожную вясну наймаюць да 15 звышштатных служачых, якія займаюцца выключна дробным разважаньнем насеньня, а таксама паўхільныя «утрусками и провесями, дающими за сезон значительную сумму недостачи».

— На допісу «Муціць вёску» («С. Б.» № 215), аб злаўжываньнях члена с.-с. Кусевіча пры разьмеркаваньні сенажаці паміж насельніцтва, зроблена дасьледаваньне, аб фактах [illegible]

— На допісу «Запасныя фонды не ўпарадкаваны» („С. Б.“ № 67 ад 24—III 27 г.) Барысаўскі райсамаддзел тлумачыць, што ў райёне маецца шмат неразьмеркаваных вучасткаў, як сенажаці, так ворнай зямлі. За адсутнасьцю тэхнічных працаўнікоў-каморнікаў разьмеркаваць гэтыя вучасткі было немагчыма.

Што-ж датычыцца яе нескарыстаньня, дык гэта няпраўда: фондавыя вучасткі штогод разьмяркоўваюцца сельсаветамі паміж безьзямельнымі і малазямельнымі сялянамі. Апроч таго большасьць вучасткаў зап. фонду, мяючыхся ў Чарнявіцкім с.-с. згодна цыркуляра НКЗВ № 5, лічацца ў іх працоўным карыстаньні.

— На допісу «Ліквідацыя Цынкевіч» («С. Б.» № 246 ад 28-X—26 г.) высьветлена, што справа па абвінавачаньню Сьцяпана Цынкевіча на 2 ч. 108 арт. КК за адсутнасьцю складу злачынства спынена.

Згодна паказаньняў загадчыка поштай Ерашова і як відаць з цэлага шэрагу даведак выдаткаваных вёсткі [illegible]

Вялікая экскурсія працоўнай моладзі.

У склад экскурсіі залічаны 201 чалавек.

ПАСЬПЯШЫЦЕ З ПРЫСЫЛКАЙ ГРОШАЙ!

Экскурсійная камісія, вылучаная рэдакцыяй газэты „Чырвоная Зьмена“, ніжэй публікуе сьпіс таварышоў, якія зацьверджаны для ўдзелу ў экскурсіі па маршруту Менск-Ленінград-Волхаўбуд-Краштадт-Менск.

Усяго паступіла з розных акругаў БССР звыш 400 заявак аб залічэньні ў лік экскурсантаў. З прычыны абмяжованага ліку льготных літараў (з 50 процантнай скідкай) камісія зацьвердзіла экскурсантамі 201 чалавек і 43 чалавекі кандыдатамі да іх.

Сьпіс кандыдатаў зацьверджан камісіяй з наступных двох меркаваньняў: 1) камісіяй узбуджана хадайніцтва аб дапаўнёнальным прадстаўленьні льготных літараў і 2) магчыма, што некаторыя з таварышоў, залічаных у склад экскурсіі, на розных меркаваньнях ня змогуць прыняць удзелу ў апошнай і на іх месца магчыма будзе залічыць кандыдатаў.

Камісія напамінае ўсім экскурсантам, што неабходна да 1 мая ўнесьці палову належачай сумы (17 р. 50 к., а для чыгуначнікаў, якія едуць па дармовых білетах—11 р. 50 к.). Таксама павінны ўнесьці гэтыя грошы і кандыдаты, каб, пры спрыяючым разьвязваньні пытаньня аб прадстаўленьні дапаўнёнальных літараў, ня было ніякай затрымкі.

Грошы трэба накіроўваць паштовымі пераводамі на адрасу: „Менск, Камсамольская, 25, кантора выдавецтва «Чырвоная Зьмена», у касу экскурсіі“.

Таварышы, якія спозьняцца з прысылкай грошай (да 1 мая), будуць з сьпісу выключаны.

Кандыдатам у экскурсанты, якія ня будуць залічаны ў склад экскурсіі, гарантуецца безадкладны зварот грошай.

Па атрыманьньні грошай экскурсантам будуць высланы адпаведныя дакументы, а таксама дасканалыя паказаньні аб часе выезду, месцы збору і г. д.

Сьпіс залічаных у экскурсію.

Менская акруга. Анішчук Г. А., Арошкер А. А.; Бэрнштэйн Ш.; Барановіч М.; Баранка П. М.; Брукор; Браўдэр Р. З.; Бычкоўскі П. А.; Васілеўскі Х. Ш.; Вальковіч Ф.; Вальфсон А. Э.; Вайсман Х. М.; Гурэвіч Н. П.; Гапэнка Ц.; Грыб В.; Гаруновіч М. А.; Грышэвіч Т. Т.; Гуманаў Б. Б.; Дзідовіч С. Е.; Жардзенкі М. П.; Затурэнская Ш. Т.; Ізакаў; Ізакава Б. І.; Іофэс; Іваноўская; Каждан Я. І.; Канонік Х. Я.; Кульбак І. Ш.; Каган Х. М.; Кулянова М. А.; Кац М. А.; Катлоў Д. М.; Ксяневіч С. А.; Костка А. У.; Каплан С. І.; Капілаў Д. Н; Літвіна Ш. Б.; Ланідус Б. І.; Майзэльс Г. Б.; Муяровіч Х.; Маршак С. Д.; Меер Х. Л.; Манусевіч І. Э.; Мікулінская Ф.; Маклуш С. Ф., Матусевіч Я. Я.; Мароная З. С.; Олікер Л. Е.; Озернова Е. Б.; Перэльман Б. І.; Плоткін А. І.; Рашрэй Р. А.; Рычык К. Л.; Сагаловіч Н. І; Сапожнікава; Сіняк А. В.; Тарановіч С.; Татаркінцкі С. М.; Фішкін І.; Філіповіч В. І.; Фрыдман А. С.; Шэмет І. І.; Швэндэль Х. С.; Шыркавец Н. М.; Шэйнман Ш. Ш.; Эйдзінаў Б.; Якшчук М. Х.

Барысаўская акруга. Астапковіч М. П.; Буцько М.; Балабудкін С.; Галай В. І.; Грайфэр С.; Дайнэка Д. М.; Дрышач Д.; Драздоў Р.; Жолнік; Жданаў Р.; Зайдэнбэрг Г.; Захараў А.; Завіленскі В. Г.; Клябанаў Б. Я.; Клябанава Ц.; Казлоўскі А.; Каплан Я.; Кліонскі Л.; Казімірчык; Курачкін А.; Казлоўскі; Лібэрман Я.; Лізавіцкая М.; Лаваронак Т.; Левін М.; Марковіч; Мінддін Л.; Манкевіч А.; Плаўнік М.; Пінхасік Г. Л.; Рубінштэйн А. Д.; Рубінчык Я. І.; Страдзе; Сапэнэвіч Т. А.; Сцеткевіч Л. Л.; Таўгэр Ф. Л.; Хацкевіч А.; Чэрнік З.; Цэйтлін І.; Шатаў Н.

Віцебская акруга. Абрамэнка; Альбэрт Р. І.; Булан І. П.; Бабасдаў